ГАЗЕТЫ
БОЛЕЕ ЧЕМ ЧАСА
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА БССР, им. В. И. ЛЕНИНА

Пролетары усіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
19 красавіка 1931 г.
№ 90 (3178)

За бальшавіцкія тэмпы ў барацьбе за лён

Мы—напярэдадні веснавой сяўбы. Ужо праз некалькі дзён паўднёвыя раёны БССР прыступяць да сяўбы. Зараз праводзіцца баявы агляд падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы ўсіх арганізацый, усіх калтасаў, бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Як адзначыў красавіцкі абʼяднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, сучасныя тэмпы калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы—нездавальняючыя. Пленум асабліва падкрэсьліў, «што ў большасьці раённых арганізацый не вядзецца барацьбы з недаацэнкай значэньня кантрактацыі і праваапартуністычнай стаўкай на самацёк, што замест масавай работы вакол кантрактацыі мае месца фармальна-бюракратычны падыход да справы. У выніку ўсяго гэтага выкананьне пляну кантрактацыі асабліва ў індывідуальным сэктары праходзіць зусім нездавальняюча». (З пост. пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Такім чынам, дырэктывы партыі і ўраду аб своячасовым сканчэньні работы па кантрактацыі ня выкананы. На 10 красавіка г. г. пляны кантрактацыі выкананы па зярнёвых культурах на 47,2 проц., лёне—на 43,8, канаплях—67,3, бульбе—49,9, сене—11,8 і г. д.

Для БССР—краіны з лёнаводным і жывёлагадоўным напрамкам сельскай гаспадаркі, выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэньне мае льняная праблема. БССР стаіць на трэцім месцы сярод саюзных рэспублік і вобласьцяй па колькасьці загатовак лёну для забясьпечаньня прамысловасьці, для экспорту. Між тым, на фронце лёназагатовак мы маем вельмі нездавальняючыя вынікі.

Так, на 15-га красавіка па БССР лёнавалакна загатоўлена толькі 40,4 проц., лёнанасеньня—60,5 проц., канапель—62,7 проц. і пянькі—16,4 проц. Гэтыя лічбы проста крычаць аб зрыве загатовак важнейшых тэхнічных культур, аб зусім нездавальняючай рабоце ў галіне льнозагатовак.

Дзе каранімца прычына гэтага ганебнага адставаньня на лёназагатоўчым фронце? Куды трэба накіраваць максымум агню для таго, каб пляны загатоўкі лёну і канапель выканаць на 100 проц.? Прычына ў тым, што значная частка раённых арганізацый недаацаніла гаспадарча-палітычнага значэньня загатовак тэхнічных культур. Прычына ў тым, што значная частка раёнаў не праводзіла клясава-вытрыманай лініі па тэхнічных культурах у адносінах да кулацка-заможных элемэнтаў. Прычына ў тым, што цьвёрдыя зданьні кулаку і заможніку да гэтага часу яшчэ ня выкананы. Прычына ў тым, што цэнтральныя, гаспадарчыя і каапэрацыйныя органы не забясьпечылі адпаведнага апэрацыйнага кіраўніцтва раённымі арганізацыямі ў гэтай важнейшай галіне загатовак. Прычына ў тым, што ў частцы раёнаў не вядзецца барацьбы з праваапартуністычнай практыкай у загатоўках лёну і канапель. Прычына, нарэшце, у тым, што вакол загатовак тэхнічных культур не мабілізаваны шырачэзныя масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, што недастаткова прапрацавана на масавых сходах беднякоў і сераднякоў пістарычная адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Усё гэта прывяло да вышэйпаказанага ганебнага адставаньня БССР у справе загатовак тэхнічных культур. Мы маем раёны, якія зьяўляюцца прыкладам праваапартуністычнай стаўкі на самацёк, якія ганебна цягнуцца ў хвасьце, якія недаацэньваюць вялізарнага гаспадарча-палітычнага значэньня загатоўкі тэхнічных культур. Вось гэтыя раёны—**Лагойскі на 10 красавіка плян загатоўкі лёнавалакна выканаў на 14,9 проц., Мазырскі—9,3, Нараўлянскі — 11,7. Парыцкі — 14,5, Сьвіслацкі—11,4, Юравіцкі—13,4, Расьнянскі—14 проц., Гомельскі—11,4, Дрыбінскі—16,3 і Асіновіцкі—17 проц.**

Ганебна адстаюць па загатоўцы лёнанасеньня наступныя раёны: **Юравіцкі на 20 красавіка выканаў 23,6 проц. заданьня, Уваравіцкі—22,3, Парыцкі—29,5, Сьвіслацкі—36,8 і Чачэвіцкі—35,8 проц.**

Толькі нямногія раёны па-бальшавіцку выканалі пляны загатовак лёнанасеньня: Чашніцкі на 135,7 проц., Лёзьненскі—117,3 проц., Плешчаніцкі—111,4 і Бягомльскі—104,3 проц.

Кантрактацыя яравых, асабліва лёну, апроч таго, што яна зьяўляецца магутным сродкам уздыму калектывізацыі на вышэйшую ступень, мае асабліва важнае значэньне і ў адносінах загатовак у першую чаргу лёну і збожжа. Між тым, як адзначыў абʼяднаны пленум ЦК і ЦКК, большасьць раённых арганізацый не вядуць барацьбы з недаацэнкай значэньня кантрактацыі, не вядуць барацьбы з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк, не разгортваюць масавай работы вакол справы кантрактацыі і фармальна бюракратычна адносяцца да гэтай справы. У выніку гэтага, на 15 красавіка мы маем сумныя вынікі правядзеньня кантрактацыі, асабліва ў індывідуальным сэктары.

Да гэтага часу вакол кантрактацыі не разгорнута масавая работа сярод беднякоў і сераднякоў. Клясавы вораг—кулак вядзе шалёную агітацыю супроць кантрактацыі і пасеву лёну. Кулакі агітуюць за тое, каб «сеяць усяго па-трошку і тым быць незалежнымі ад дзяржавы». Гэтай шалёнай агітацыі кулацтва аднак не даецца рашучага адпору, у выніку чаго ў раёне закантрактавана лёну па аднаасобным сэктары толькі 35 проц. У Петрыкаўскім раёне (Камаровіцкі с.-с.) масавая работа не разгорнута, цьвёрдых заданьняў па веснавой сяўбе кулацка-заможным элемэнтам вёскі ня дадзена. У Магілёўскім раёне па радзе сельсаветаў адозвы па кантрактацыі і да гэтага часу яшчэ не прапрадаваны. У Веткаўскім раёне з 32 сельсаветаў кантрактацыя праведзена толькі ў 18.

Усе гэтыя прыклады яскрава гавораць аб тым, што там, дзе няма адпаведнай масава-палітычнай работы, дзе не завострана пытаньне на барацьбе з кулацка-заможнымі элемэнтамі, дзе не вядзецца рашучай барацьбы з правямі права апартуніцму на практыцы, дзе наогул няма барацьбы з недаацэнкай гаспадарча-палітычнага значэньня кантрактацыі,—там зрываецца, там правальваецца справа кантрактацыі.

Тэрмін выкананьня плянаў кантрактацыі збожжавых культур скончыўся 15 красавіка. Зараз мы падапульваем вынікі гэтай работы. Тыя раёны, якія ня выканалі пляны кантрактацыі збожжавых (а такіх большасьць), павінны зараз-жа неадкладна і рашуча на 100 проц. выканаць заданьні па кантрактацыі. 5 мая—тэрмін сканчэньня кантрактацыі лёну. За 2 з лішкам тыдні, што засталіся да гэтага тэрміну, павінна быць праведзена поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі лёну, бо **«парушэньне гэтых тэрмінаў не павінна быць дапушчана ні ў якім разе»** (з дырэктывы ЦК УсеКП(б).

Заканчваючы пляны кантрактацыі па збожжавых культурах на 100 проц., трэба да 5-га мая ўсе сілы, усе сродкі сканцэнтраваць на поўнае выкананьне кантрактацыі тэхнічных культур, увязваючы гэтую работу з бальшавіцкім правядзеньнем падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і шырокім разгортваньнем калектывізацыі. Гэтага можна дабіцца толькі самай рашучай, самай незамірнай барацьбой з кулацка-заможным элемэнтам вёскі, які спрабуе затармазіць, сарваць справу кантрактацыі тэхнічных культур. Гэтага трэба дабіцца толькі самай бязьлітаснай, самай рашучай барацьбой з праваапартуністычнай практыкай, са стаўкай на самацёк у справе кантрактацыі. Гэтага можна дабіцца толькі разгортваючы масавую работу па растлумачэньні адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі сярод калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў. Гэтага можна дабіцца не фармальна-бюракратычнымі адносінамі да заключэньня дагавораў, а толькі пры належнай падрыхтоўцы і пры актыўным удзеле мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Вядучы масавую работу сярод калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў, вядучы самую рашучую бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, з «яваўцкімі» загібамі, з усякім прымірэнцтвам да апартуністычных скажэньняў лініі партыі, рашуча ў корані прасякаючы варожую дзейнасьць кулака—мы выканаем баявы загад партыі, мы закончым кантрактацыю ў тэрмін, мы зробім кантрактацыю магутным падважнікам новага ўздыму калектывізацыі, мы забясьпечым перамогу на гэтым важнейшым вучастку другой бальшавіцкай вясны.

Рэвалюцыя ў Гішпаніі

КРЫВАВЫЯ БАІ РАБОЧЫХ З ПАЛІЦЫЯЙ І ВОЙСКАМ

ПАРЫЖ, 17-IV. Паводле паведамленьня агенцтва Гавас, у Сэвільі (Гішпанія) рабочыя камуністы вядуць энэргічную агітацыю заклікаючы рабочых да забастоўкі.

Забаставалі будаўнічыя рабочыя і пробачная фабрыка. З раду вёсак Сэвільскай вобласьці прыбываюць сяляне ў Сэвілью з камуністычнымі сьцягамі пад лёзунгам «няхай жывуць саветы». Паліцыя шырымае меры недапушчэньня рэвалюцыйных сялян у горад. Праведзены шматлікія арышты.

„Гішпанія перажывае часы кераншчыны"

ЛЁНДАН, 17-IV. Паступаючыя з Гішпаніі паведамленьні сьведчаць аб узрастаючай рэвалюцыйнай актыўнасьці рабочых і сялян.

У Сэвільі рабочыя спрабавалі здабыць сабе зброю у майстэрнях зброі. Паліцыя распачала страляніну па рабочых. Адзін рабочы забіты, 20 паранена. Далей рабочыя, на чале з камуністамі, спрабавалі захапіць рэспубліканскі клюб, але асада рабочых была адбіта сіламі паліцыі і войска. Горад абвешчаны на ваенным палажэньні.

У Андалузіі адбываюцца сялянскія хваляваньні, накіраваныя супроць паўфэадалаў буйных абшарнікаў, жорстка эксплёатуючых сялянскае насяленьне.

У Більбао рабочыя атакавалі турму і вызвалілі ўсіх палітычных зьняволеных. Недалёка ад Більбао рабочыя камуністы спрабавалі захапіць у свае рукі кантроль над фабрыкамі і заводамі. Камуністы выступалі пад лёзунгам «рэспубліка павінна быць камуністычнай». Паліцыя і войска напалі на рабочых. Шмат раненых.

Дэманстрацыі рабочых і сялян, якія адбываюцца па ўсёй краіне, выклікаюць трывогу ня гішпанскай, так і заўрубежнай буржуазіі. **«Дэйлі Тэлеграф»** піша: **«Гішпанія перажывае часы кераншчыны і ніхто ня можа сказаць, хто пераможа: або канстытуцыйны ўрад або бальшавізм».**

ЛЁНДАН, 17. Паводле паведамленьняў з Барсэлёны паміж галавой Каталонскага ўраду Васыя і часовым мадрыдзкім урадам дасягнута згода, па якой Каталоніі ня будзе прысвоена назва каталонскай рэспублікі. Яна будзе называцца «каталонская дзяржава ў гішпанскай рэспубліцы».

Каталонская каталіцкая царква апублікавала заяву, у якой прызнае новы лад.

Францыя прызнала часовы ўрад Гішпаніі

ПАРЫЖ, 17. Паводле паведамленьня агенцтва Гавас, францускі ўрад прызнаў часовы ўрад Гішпаніі.

Шалёны разгул фашысцкага тэрору ў Югаславіі

ВЕНА, 9-IV. Паводле паведамленьня белградзкага карэспандэнта газэты **«Македонія»**, якая выдаецца ў Салоніках, **у Югаславіі вельмі абвастрыўся тэрор.** Перасады па краіне дазваляюцца толькі па спэцыяльных прапусках. **Утвораны сотні арыштаў, прычым, з прычыны перагружанасьці турмаў, арыштаваныя разьмешчаны па школах. На чыгунках уведзена ўзмоцненая паліцэйская варта, а цягніці напамінаюць паліцэйскіх і шпіёнаў.**

Абвастрэньне тэрору — адказ фашысцкай дыктатуры на ўзмацненьне рэвалюцыйных выступленьняў рабочых і сялян, на сыпіну якіх буржуазія хоча ўзваліць усе страты ўсё больш паглыбляючага эканамічнага крызісу.

Усё яшчэ атрымліваюцца зьвесткі аб хваляваньнях і ўзброеных выступленьнях сялян. Так, у сельскай мясцовасьці недалёка Ніша ў пачатку красавіка адбывалася двухгадзінная бойка паміж сялянамі і зборшчыкамі падаткаў. У Славеніі быццам выкрыта змова супроць ураду і ўтворана шматлікія арышты. Рад вышэйшых афіцэраў сасланы ў правінцыю.

Дыпляматычны канфлікт Польшчы з Данцыгам

БЭРЛІН, 15-IV. Дыпляматычны прадстаўнік Польшчы ў Данцыгу **Страсбургер** падаў у адстаўку. Страсбургер матывуе сваю просьбу аб адстаўцы тым, што пасьля нядаўных падзей у Данцыгу безапаснасьць польскага насяленьня нічым не гарантавана.

У нямецкіх палітычных колах матывіроўка Страсбургера выклікала зьдзіўленьне, бо **пытаньне аб адстаўцы было вырашана ўжо некалькі месяцаў назад.**

Правая «Дэйчэ цэйтунг» лічыць, што аргумэнты Страсбургера бязумоўна ўзгоднены з польскім урадам. Гэта, па думцы газэты, сьведчыць аб тым, што **Польшча пачынае ў Данцыгу гульню з агнём,** вынікі якой нельга прадугледзець. «Калі Польшча мае намер гуляць з агнём,—піша газэта,—дык няхай яна ведае, што сучасная Нямеччына не зьяўляецца Нямеччынай 1918 году і яна не дапусьціць, каб Польшча яшчэ раз паставіла яе перад адбыўшымся фактам».

ДАНЦЫГ, 15-IV. Адстаўка Страсбургера распэньваецца ў сьвядомых палітычных колах, як добра ўзважаны і пасьлядоўны крок Польшчы ў праводзімай ёю антыданцыгскай кампаніі.

Адстаўкай Страсбургера напярэдадні абгаварэньня канфліктаў паміж Данцыгам і Польшчай у Лізе нацый Польшча імкнецца прадэманстраваць упадае прыгнечаньне польскай меншасьці ў Данцыгу. Частка данцыгскага друку тлумачыць адстаўку тым, што Страсбургер зрэзумеў поўную немагчымасьць сваёй дзейнасьці ў Данцыгу і называе гэтую адстаўку «бутафорскім громам».

Зьезд сялян-індэйцаў ў Кайамбе

⊙ **Паводле паведамленьня з Эквадора, у Кайамбе,** ня гледзячы забароны ўладаў, адбыўся зьезд сялян—індэйцаў, на якім было прадстаўлена **200.000 чалавек.** Канфэрэнцыя абгаварыла пытаньні аб мерах барацьбы з эксплёатацыяй сельска-гаспадарчых рабочых, прыгнечаньнем жанчын і дзяцей, а таксама пытаньне аб устаноўленьні адзінага фронту рабочых і сялян і стварэньні фэдэрацыі сялян—індэйцаў. Калі было абвешчана аб скліканьні зьезду, улады выдалі загад аб забароне зьезду і арыштавалі некалькі кіраўнікоў сялянскага руху і дзеячоў нелегальнай кампартыі. Шмат якія дэлегаты, якія накіроўваліся на зьезд, былі на дарозе затрыманы атрадамі, дзяжурыўшымі на ўсіх шляхох да Кайамбы.

Міжнародная хроніка

⊙ **Сафійскія газэты (Балгарыя)** друкуюць заяву начальніка паліцыі аб тым, што ў будучым дазвол на ўезд у СССР будзе даваццa толькі тым асобам, якія пасьля звароту з СССР ня будуць весьці бальшавіцкай «прапаганды».

⊙ **Лёнданская газэта «Ньюс Кронікль»** паведамляе, што Лойд Джордж, магчыма, наведае СССР у верасьні. Газэта піша: «Лойд Джордж вельмі цікавіцца пяцігадовым плянам і жадае сам азнаёміцца з яго вынікамі і правядзеньнем у жыцьцё».

⊙ **З Марсэля прыбыў у Парыж былы гішпанскі кароль Альфонс.** Газэта паведамляе, што «кароль быў сустрэнуты прадстаўніком прэзыдэнта, міністэрства замежных спраў, гішпанскім паслом у Парыжы і прадстаўнікам. францускай і гішпанскай буржуазіі.

⊙ **Уладары японскіх Кульбас-Амоніевых** прадпрыемстваў зьвярнуліся да ўраду з хадайніцтвам прыняць меры супроць дэмпінга нямецкага, ангельскага, амэрыканскага і францускага Кульбас-Амонія, які шырока ужываецца ў сельскай гаспадарцы.

⊙ **Забастоўка будаўнікоў у Саксоніі, Цюрынгіі і Ангальце працягваецца з рэдкай упартасьцю.** У Саарскай вобласьці фронт бастуючых непахісчына не зьяўляецца Нямеччынай 1918 году і яна не дапусьціць, каб Польшча яшчэ раз паставіла яе перад адбыўшымся фактам».

⊙ **У сувязі з пасьняховым наступленьнем у Нікарагуа** пастанцыі **ВМС** Злучаных Штатаў адпраўлен яшчэ адзін крэйсэр, які накіраваўся да ўсходняга ўзьбярэжжа Нікарагуа. У агульным на гэтым усходнім узьбярэжжы зараз знаходзіцца 4 караблі ваенных ПАЗШ.

⊙ **На Філіпінскіх астравох (Амэрыканская калёнія ў Ціхім акіяне)** арыштаваны генэральны сакратар рэвалюцыйнага рабочага кангрэсу (прылягаючага да Ціхаакіянскага сакратарыяту прафсаюзаў) і сакратар кампартыі **тав. Эваўжаліста,** старшыня рабочага кангрэсу і старшыня рэвалюцыйнай сялянскай фэдэрацыі прылягаючай да Крэстінтэрна, Манахан, а таксама відны дзеяч рабочага кангрэсу Амбросыо. На працяку лютага арыштаваны таксама шмат якія дзеячы кампартыі рабочага кангрэсу і сялянскай фэдэрацыі.

⊙ **Паводле афіцыйных даных, на 1-га красавіка ў Італіі налічвалася 709.000 беспрацоўных,** з якіх дапамогу атрымлівалі толькі **230.000.**

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Арганізуем усесаюзны „дзень трактара"

МАСКВА. Оргбюро саюзу рабочых земляробчых саўгасаў, рабочых МТС і батракоў і рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў **пастанаўляе: правесьці ўсесаюзны «дзень трактара» у саўгасах, МТС і калгасах у пэрыяд паміж 10 і 20 мая.**

Зьмест «дню трактара» павінен быць: падвядзеньне вынікаў; правільнага скарыстаньня трактара, увядзеньня зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічанай язды, барацьбы з паломкамі, прастоямі і перарасходам гаручага.

Мабілізацыя рабочых і калгасьнікаў у раёнах позьняй сяўбы на пасьняховае правядзеньне сяўбы.

Выяўленьне лепшых паказчыкаў перадавікоў-ударнікаў у выкарыстаньні трактара, прычынных машын і масавае прымяненьне вопыту ў саўгасах, МТС і калгасах.

Праверка стану трактарнага парку. Забясьпечыць шпаркі рамонт і высокую яго якасьць, асабліва ў момант падвышэньня работ.

Падвядзеньне вынікаў практычнай вытворчай дапамогі саўгасам, МТС, калгасам, беднякам і сераднякам аднаасобнікам, у асабліваасьці ў арганізацыі працы калгасьнікаў, увядзеньне зьдзельшчыны і новага прыцёку ў калгасы.

У «дзень трактара» правесьці шырокае прэміраваньне трактарыстаў ударнікаў, саўгасаў і МТС, якія далі лепшыя паказчыкі ў выкарыстаньні трактара і добрага догляду за ім.

Вылучыць спэцыяльныя ўсесаюзныя, рэспубліканскія, краёвыя і абласныя прэміі лепшым саўгасам, МТС і ў кожным саўгасе прадпрыемстве прэміі для лепшых трактарыстаў-ударнікаў.

Даручыць усім мясцовым арганізацыям саюзаў рабочых земляробчых саўгасаў, рабочых МТС і батрацтва і рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў і ўсім саюзным органам друку шырока разгарнуць работу па падрыхтоўцы да парвядзеньня «дню трактара».

Бальшавіцкія тэмпы—садовагароднай справе

(ПАСТАНОВА СНК СССР).

МАСКВА, 17. СНК СССР у мэтах хутчэйшага скарыстаньня пад гародныя і садовагародныя культуры зямельных вучасткаў, размешчаных вакол сталіц, буйных гарадоў і іншых цэнтраў, а таксама прыгодных для гэтай мэты гарадзкіх зямель пастанавіў: прапанаваць урадам саюзных рэспублік:

Устанавіць не пазьней 25 красавіка ў буйных гарадох і прам. нтрах, вакол якіх у вызначанай паласе павінен быць паступова ажыцьцёўлены да вясны 31 г. поўны пераход на гародныя і садова-ягадныя культуры.

Паласа гэта вызначаецца ў адпаведнасьці з мясцовымі патрэбамі, але ня звыш 25 кілёмэтраў радыусам, абавязаць адпаведныя мясцовыя саветы не пазьней 10 мая 31 г. распрацаваць пляны выкарыстаньня пад гародныя і садова-ягадныя культуры прыгародных зямель у вызначанай паласе, а таксама прыдатных для гэтай мэты гарадзкіх зямель. Мясцовыя саветы павінны прадугледзіць у плянах і забясьпечыць правядзеньне наступных мерапрыемстваў: выкарыстаць вясну 31 году пад гародныя садова-ягадныя культуры прыдатныя для гэтай мэты пустуючыя землі ў гарадох і прамцэнтрах, а таксама пустуючыя прыгарадныя землі. Апрацаваць пад гародныя і садова-ягадныя культуры нязручныя для гэтай мэты вучасткі выганаў і малаўраджайных пакосаў, пачынаючы з вясны 31 году.

Устанавіць у арганізаваных гаспадарках сыстэму садасеву ўвядзеньнем траў у разьмеры, які-б забясьпечваў гэтыя гаспадаркі неабходнай кольскасьцю кармоў.

Адзначаныя мерапрыемствы павінны быць праведзены на аснове далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і арганізацыі вытворчасьці гародніны, садавіны і ягад спажывецкай кааперацыяй і саўгасамі.

Адказнасьць за правядзеньне гэтых мерапрыемстваў усклясьці на мясцовыя саветы.

Абавязаць Калгасцэнтр Саюзу ССР забясьпечыць будаўніцтва гародных і садова-ягадных калгасаў у прыгараднай зоне неабходнымі сродкамі, інструктаваньнем і кадрамі. Абавязаць мясцовыя саветы прыцягнуць да ажыцьцяўленьня адзначаных мерапрыемстваў грамадзкія арганізацыі і калгасьнікаў, а таксама правесьці растлумачальную кампанію сярод прыгараднага бядняцка-сераднякцкага сялянства.

Абавязаць народны камісарыят земляробства Саюзу ССР забясьпечыць правядзеньне не пазьней 1-га кастрычніка 1931 году гаспадарчыя землеўпарадкаваньні ў вызначанай паласе (§«а» арт. 1).

Забясьпечыць як тыя, так і другія каапэрацыйныя арганізацыі гародным насеньнем, а таксама сельска-гаспадарчымі машынамі і дробным інвэнтаром; узмацніць апранамічнае абслугоўваньне рэарганізуемых гаспадарак.

ПРАВЯРАЦЬ РУБЛЁМ

выкананьне фінансава-гаспадарчых плянаў

Аб'яднаньні Белкаркамснабу ня думаюць пераходзіць на гаспадарчы разьлік

Фінплян першага кварталу выканан у Аршанскім раёне на 76,2 проц., у Капаткевіцкім раёне—на 20 проц., Бабруйскі райкалгассаюз свой плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу выканаў усяго толькі на... 0,5 проц.

Поўнасьцю рэалізаваць пастанову СНК Саюзу ад 20 сакавіка 1931 г.

Запоўніць прарыў

Фінансавы плян **першага кварталу** гэтага году **Аршанскім раёнам** выкананы на 76,2 проц. Толькі па некаторых галінах збор сродкаў працоў добра і плян выкананы, напрыклад: мэтавая пазыка рэалізавана на 103,5 проц., заданьне па звароту пазык сельска-гаспадарчага крэдыту — на 105,8 проц., збор паёў па жыллакапэрацыі—на 102,2 проц., збор паёў па інвалідзкай каапэрацыі—на 123,3 пр., рэалізацыя аўтааблігацый выканана на 603 проц., заданьне па зборы паёў па ЦРК—на 106,1 проц.

Аднаразовы культурны збор па раёне спагнаны на 81 проц., сельска-гаспадарчы падатак—на 89,9 проц., страхавіцьня плацяжы—на 90 проц. і самаабкладаньне сабрана на 80,9 пр.

Амаль не рэалізаваны: рыначная пазыка ўсяго на 7,2 проц. і акцыі Трактарацэнтру—на 5,3 проц. Заданьне па ўцягненьні ўкладаў у ашчадкасы выканана на 9,8 проц. Вельмі слаба працоў збор сродкаў паёў і мэтавых укладаў па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі,—усяго на 18,4 проц. Ня выканала свае заданьне па мабілізацыі сродкаў Плодагароднінна. Яна сабрала толькі 24 проц. заданьня. Таксама і спажывецкае т-ва «Чырвоны араты» вельмі адстала па ўсіх зборах сродкаў, па зборы паявых яна выканала заданьне на 27,8 проц., па зборы ўкладаў і авансаў — на 28,4 проц.

Недавыкананьне фінпляну па сельска-гаспадарчым падатку тлумачыцца вялізарным адставаньнем некаторых сельсаветаў і адсутнасьцю належнага націску на заможныя гаспадаркі. Дадзены фонд на скідкі-ільготы і на скідкі па безнадзейных недоімках—не разьмешчаны да гэтага часу. Аднаразовы збор, страхоўка і самаабкладаньне з-за недастаткоўай работы некаторых сельсаветаў не было магчымасьці выканаць. Што-ж да рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, дык на рэалізацыю апошніх і да гэтага часу не зьярталася ўвага ні з боку калгасаў, ні з боку райфінчасткі, райбанку і райкалгассаюзу. Невыкананьне заданьня па ўцягненьні ўкладаў у ашчадкасу тлумачыцца выключна тым, што за апошнія часы была спынена амаль усякая работа па вярбоўцы ўкладчыкаў. Уклады ішлі ў ашчадкасу толькі самацёкам. Бязьдзейнічалі і камісіі сацзейнічаньня дзяржкрэдыту.

А. К.

Рабселькоры і ўдарныя рабселькораўскія брыгады павінны падхапіць прыклад рабселькора т. Арэшкава

Мабілізую сродкі

Я, брыгадзір газ. «Сав. Бел.» абвяшаю сябе ўдарнікам па мабілізацыі сродкаў. Распачаў канкрэтную работу: рэалізаваў 70 білетаў 5-й Усесаюзнай лётарэі Асавіяхіма, рэалізаваў газэт на 18 руб. 50 кап., завербаваў укладчыкаў у касу ашчаднасьці на 19 руб. 50 кап., у карысьць МОПР'у сабраў 12 р. 73 кап.

Каб апраўдаць сваё званьне ўдарніка, абязуюся яшчэ больш накіраваць сваю энэргію на мабілізацыю сродак, на выкананьне нашых плянаў.

Выклікаю на сацспаборніцтва сельскораў м. Старасельле.

Брыгадзір газ. «Сав. Бел.»
У. АРЭШКАЎ

Да адказнасьці прыхільнікаў кулака

(АД НАШАГА БАБРУЙСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Выкананьне **фінансавага пляну** па **Бабруйскім раёне** па асобных галінах знаходзіцца ў надзвычайна кепскім стане. Добра выкананы пляны сельска гаспадарчага падатку—100 процантаў, страхоўкі—96 процантаў, збору паявых сродкаў па Цэрабкопу і спажывецкай каапэрацыі—99 і 122 процанты. А ў працы па звароту пазык па сельска-гаспадарчым крэдыце, па мабілізацыі сродкаў, па саматужна-прамысловай каапэрацыі, па паступленьні ўступных узносаў па калгасным сыстэме і садовагароднай сыстэме яшчэ на сёньняшні дзень ёсьць вялізарнейшы прарыў, які кладзецца ганебнаю плямаю на ўсю работу па мабілізацыі сродкаў у раёне.

Надзвычайна кепска праводзіцца работа па распаўсюджваньні трактарных абавязацельстваў. Заданьне, дадзенае на першы квартал 1931 году, выканана ўсяго на 11,7 процантаў. Паявыя сродкі і мэтавыя ўклады па сельска-гаспадарчым крэдыце выкананы ўсяго на 13,5 процантаў. Інвалідная каапэрацыя плян мабілізацыі сродкаў выканала на 51 процант.

Ня гледзячы на тое, што агульны плян па абавязковых плацяжах па раёне выкананы цалкам, па асобных сельсаветах ёсьць і на сёньняшні дзень недавыкананьне па падатку, страхоўцы, асабліва па культзборы і самаабкладаньні. Так, Мальлеўскі сельсавет да гэтага часу выканаў заданьне па сельска-гаспадарчым падатку толькі на 73 проц., Старцоўскі—на 78 проц., Хімоўскі—на 71 проц. Па страхоўцы па Харлапавіцкім, Сычкаўскім, Мышкаўскім, Бешасьнёўскім і Каменскім сельсаветах недавыкананьне дасягае 25—30 процантаў.

Сельскія саветы праяўляюць праваапартуністычную практыку, патураючы кулацкім гаспадаркам у мабілізацыі сродкаў. Замест 36 тысяч рублёў, якія павінны паступіць з кулацкіх гаспадарак па культзбору, паступіла толькі 12 тысяч; па самаабкладаньні спагнана з кулацкіх гаспадарак усяго толькі 26—27 процантаў належачай сумы.

Гэтыя прарывы на фронце мабілізацыі сродкаў павінны прымусіць раённыя арганізацыі Бабруйскага раёну ўзяць рашучы курс на ліквідацыю прарываў у самы бліжэйшы час. З кулацкіх гаспадарак павінны быць спагнаны ўсе плацяжы. Павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці тыя, хто ў рабоце па выкананьні фінпляну патурае кулаку, тым самым праводзячы праваапартуністычную практыку.

Д. Аланскі.

Толькі 20 проц. квартальнага пляну

На **Капаткевіцкім раёне** плян мабілізацыі сродкаў знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Выканана толькі 20 проц. квартальнага пляну. Праўленцы Капаткевіцкага райспажыўтаварыства нават і ня думаюць пра гэту справу, далі заданьне кожнай краме—і ўсё, а аб праверцы выкананьня і штурму слабых месц зусім не клапоцяцца.

Гэтак-жа на справу глядзіць і РВК.

Старшыня РВК тав. Караленка склікаў прадстаўнікоў установаў, даў каму вымову, а каму іншыя спагнаньні, і гэтым справа мабілізацыі сродкаў была скончана.

Такая работа тлумачыцца вось чым: праўленьне райспажыўтаварыства застрахавана тым, што дало заданьне па крамах, а РВК абмежваўся тым, што даў некаторым працаўнікам вымовы. Гэткая «самастрахоўка» ніякай карысьці не дае, бо габінэтныя пастановы без грамадзкасьці нічога даць ня могуць.

Пчала.

ПЕРШАМАЙСКІЯ СЬВЯТЫ АДЗНАЧЫМ

утварэньні фонду для пабудовы ў СССР інтэрнацыянальных дамоў для дзяцей палітзьняволеных у каталістычных краінах.

У клясавай барацьбе за рубяжом сусьветны пралетарыят нясе вялікія ахвяры,—сотні тысяч лепшых рэвалюцыянэраў пакутуюць у турмах капіталу, сотні тысяч дзяцей зарубежных палітзьняволеных знаходзяцца бяз усякай дапамогі. МОПР прымае ўсе меры па аказаньні матар'яльнай дапамогі дзецям барацьбітоў рэвалюцыі, МОПР прымае ўсе меры, каб аберагчы іх ад чуждага на іх уплыву з боку філянтрапічных - клясаварожых пралетарыяту установаў за рубяжом.

У СССР—бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту, усё часьцей пачалі паяўляцца новыя, зусім асаблівыя «палітычныя» эмігранты—гэта прыбываючыя да нас з капіталістычных краін дзеці загінуўшых барацьбітоў, дзеці рэвалюцыянэраў, якія пакутуюць у турмах буржуазіі. Гэтых маленькіх гасьцей з вялікай радасьцю сустракаюць працоўныя, МОПРарганізацыі прымаюць над імі апэкуны, зьмяшчаюць у дзіцячыя дамы і клапацілва сачаць за іх далейшым жыцьцём.

Аб забясьпецы прыбываючых маленькіх гасьцей, аб выхаваньні іх у інтэрнацыянальным духу, вынёс спэцыяльнае рашэньне III-ці Усесаюзны зьезд МОПР'у, які пастанавіў правесьці кампанію збору сродкаў на пабудову ў СССР інтэрнацыянальных дамоў для дзяцей зарубежных палітзьняволеных. Гэтая кампанія прыстасоўваецца да першамайскага сьвята, калі па ўсіх арганізацыях МОПР'у Саюзу будзе праводзіцца збор грошай для пабудовы інтэрнацыянальных дамоў.

Першы Інтэрнацыянальны Дзіцячы Дом МОПР закладваецца 1-га мая ў Іванаве-Вазнесенску. Гэты дом будуецца па ініцыятыве членаў МОПР'у Іванава - Вазнесенскай арганізацыі МОПР.

Пытаньне аб удзеле арганізацыі МОПР БССР у пабудове Інтэрнацыянальных Дзіцячых Дамоў, было абгаворана на апошнім паседжаньні прэзыдыуму ЦК МОПР, і была вынесена пастанова сабраць адначасовы інтэрнацыянальны першамайскі ўзнос у суме 100.000 руб. да 15-га мая.

Кожны член МОПР'у павінен абавязкова выканаць свой інтэрнацыянальны абавязак у першамайскія дні перад барацьбітамі рэвалюцыі, уносячы адначасова: ня менш аднаго руб., калі плаціць 1 р. 20 к. у год членскіх узносаў, ня менш 30 к., калі плаціць 60 к. членскіх узносаў і ня менш 15 кап., калі плаціць 24 к. у год. Юныя прыхільнікі МОПР'у і дзеці павінны дапамагчы у стварэньні гэтага фонду па меры іх матар'яльных магчымасьцій.

Пастаўленая задача па збору 100.000 руб. будзе выканана к тэрміну толькі тады калі МОПР-арганізацыі БССР за зараз-жа разгарнуць растлумачальную работу аб важнасьці пабудовы інтэрнацыянальных дамоў МОПРу у СССР. Павінны прысьці на дапамогу ў гэтай справе камсамол і піянэрскія арганізацыі БССР—у першую чаргу, а таксама, прафсаюзы, дэлегацкія сходы і ўся пралетарская грамадзкасьць.

Правядзімы Міжнародны Дзіцячы Тыдзень з 2-га па 9-е мая павінен быць максымальна скарыстаны для мабілізацыі ўсіх пралетарскіх дзяцей БССР па ўдзелу ў зборы сродка

5 МАЯ—КАНЧАТКОВЫ ТЭРМІН КАНТРАКТАЦЫІ ЛЕНУ

„...ПАРУШЭНЬНЕ ГЭТАГА ТЭРМІНУ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ДАПУШЧАНА НІ У ЯКІМ РАЗЕ" (ЦК УсеКП(б)

ЦЬВЕРДА ПАМЯТАЦЬ, ШТО ТЭМПЫ РАШАЮЦЬ!

Дырэктывы партыі і ўраду ня выкананы

Пастанова

Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

ПРА ХОД КАНТРАКТАЦЫІ.

Выслухаўшы даклад НК-РСІ т. Калвіна пра выпікі праверкі ходу кантрактацыі яравых культур, Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае, што дырэктывы СНК аб сваячасовым скончэньні работы па кантрактацыі ня выкананы. Кантрактацыя праведзена зусім нездавальняюча. На 10-IV—1931 г., плян па кантрактацыі выкананы па зярнёвых на 47,2 проц., лёну—43,8 проц., канаплях—67,3 проц., бульбе—49,9 проц., сену—11,8 проц. і г. д. Асноўнымі прычынамі невыкананьня зьяўляюцца:

а) што пэнтры сельгаспадарчай каапэрацыі (Бэлмалжывсаюз, Беллёнаканапляводсаюз, Белсадгародсаюз і Белнасеннаводсаюз) нядбайна аднесьліся да правядзеньня работы па кантрактацыі, забясьпечаньне раёнаў адведзенымі матэрыяламі па заключэньні дагавораў зацягнулася да сакавіка месяца; паміж асобнымі сыстэмамі сельскагас падарчай каапэрацыі няма належнай дагаворанасьці, у выніку чаго выяджаючыя працаўнікі паасобных сыстэм праводзяць работу па кантрактацыі толькі тых культур, якія ўскладзены на іх сыстэмы;

б) слаба разгорнута масавая работа па заключэньню дагавораў з калгасамі і адзінаасобнымі бядняцка-сераднякімі гаспадаркамі.

Раённыя выканаўчыя камітэты і райкаапсаюзы, асабліва Заслаўскі, Журавіцкі, Дубровенскі і Сьмілавіцкі не зьвярнулі належнай увагі на прапраноўку адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, а таксама і ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі яравых культур;

в) у паасобных раёнах (Жлобінскі і Чаўскі) зусім не распачата праца па правядзеньні кантрактацыі.

Бяручы пад увагу вышэй паказанае, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белмалжывёлсаюзу, Беллёнаканапляводсаюзу, Белсадгародсаюзу і Белнасеннаводсаюзу пад адказнасьць таварышоў: Жыромскага, Лаціса, Панамарова і Жарына забясьпечыць поўнае выкананьне пляну кантрактацыі і ў тэрміны, якія вызначаны ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

2. У тых выпадках, калі было дапушчана заключэньне дагавораў аб кантрактацыі бяз удзелу масы калгасніка, а таксама, калі заключэньне дагавораў з адзінаасобнымі бядняцка-сераднякімі гаспадаркамі ня было належным чынам падрыхтавана і памянёныя адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР ня былі прапрацаваны, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і райкаапсюзам недкладна выправіць дапушчаныя памылкі.

3. Прапанаваць Наркамснабу, Белмалжывёсаюзу, Беллёнаканапляводсаюзу, Белсадгародсаюзу і Белнасеннаводсаюзу, мабілізаваць работнікаў свайго апарату для ўзмацненьня работы па кантрактацыі і праверцы якасьці заключаных дагавораў.

4. Даручыць Наркамзему і Наркамснабу забясьпечыць сваячасовае аперацыйнае кіраўніцтва працаю ўсіх цэнтральных кантрактуючых арганізацый і раённых зямельных і каапэрацыйных органаў.

5. Прапанаваць Беллёнаканапляводсаюзу, пад адказнасьць тав. Лаціса, на працягу трох дзён даць паказаньні раёнам аб кантрактацыі лёну на трэсту.

6. Прапанаваць Народнаму Камісару яту Снабжэньня выявіць тыя раёны, якія зусім не разьмясьцілі кантрольных лічбаў па кантрактацыі насеньня і асобна паведаміць аб гэтым Камісію Выкананьня.

7. Паказаць старшыням Жлобінскага і Чаускага раённых выканаўчых камітэтаў т. т. Антонаву і Сакалову на праяўленую бязьдзейнасьць і адсутнасьць усякай працы па правядзеньню кантрактацыі, прапанаваўшы ім на працягу 5 дзён скончыць усю працу па правядзеньні кантрактацыі.

8. Паказаць Старшыні Талочынскага Раённага Выканаўчага Камітэту т. Геўрасеву на недапушчальнасьць скарамлівання калгасамі для жывёлы высадкаў кораньплодаў.

Старшыня Камісіі Выкананьня Пры СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН.
15 красавіка 1931 г.
г. Менск.

Пералому яшчэ няма

Змагацца за сваячасовае выкананьне пляну

Наводле вестак Наркамснабу БССР на 16 красавіка плян кантрактацыі зярнёвых культур выкананы на 53,8 проц. (на 11 красавіка—47,2 проц.). Тэмпы кантрактацыі зусім нездавальняючыя, за мінулую пяцідзёнку прырост дасягае ледзь на 6,6 проц..

Ганебна адстае адзінаасобны сэктар, які выканаў плян па кантрактацыі на 45,5 проц. Лепш спраўляецца з гэтай задачай калгасны сэктар, выканаўшы 93 проц. пляну.

Зусім дрэнна ідзе кантрактацыя сена. На 16-га красавіка плян па сене выкананы толькі на 15,3 проц.

Таксама дрэнна праходзіць кантрактацыя тэхнічных культур. Па лёна-валакну плян выкананы толькі 49,7 проц. (11 красавіка—43,8 проц.); прычым, калгасны сэктар выканаў 57,1 проц., адзінаасобны—43,9 проц. Плян кантрактацыі пянькі выкананы на 62,7 проц.: калгасы—50,4 проц., адзінаасобны сэктар—45 проц. Плян па бульбе—выкананы на 59,2 проц.: калгасы—62 проц., адзінаасобны сэктар—58,6 проц.

Маецца пэўны пералом у кантрактацыі гародных культур. Капусты закантрактавана 84 проц., буракоў—117,5 проц. цыбулі—74,2 проц., буркоў—70 проц., махоркі—64 проц.

Пашкаўцы, прымеце выклік цешаўцаў!

Вучэцеся ад іх змагацца за бальшавіцкія тэмпы

Цішоўская партыйная ячэйка і сельсавет паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў выкананьні пляну кантрактацыі. Сельсавет рапартуе рэкорднымілічбамі. Дзякуючы шырокай папулярызацыі сярод калгасных і бядняцка-сераднякіх мас адозваў ЦК КП(б)Б, і СНК БССР аб кантрактацыі яравых, вы значаныя заданьні па кантрактацыі па сельсавеце перавыкананы на 70,8 проц. Перавыкананьне маецца па ўсіх культурах. Напрыклад па ячмені заданьне—31 га, закантрактавана—39,62 га, па аўсу заданьне—80, закантрактавана—99, па ёлне заданьне—4 га, закантрактавана—11,64 га, бульбе—36, закантрактавана 110 га. У парадку сустрачнага пляну закантрактавана: шпаніцы—6,93 га, вікі—8,25 га, канюшыны—7,60 га, кораньплодаў—0,25 га, канапель—0,6 га.

Цішоўскі сельсавет выклікае на сацспаборніцтва Добрасьнеўіцкі і Пашкаўскі сельсаветы. Гэты сельсавет павінен быць прыкладам для ўсіх сельсаветаў Магілёўскага раёну. Па ім трэба раўняцца і браць з яго прыклад

Н.

Калгасы далі 117 проц., аднаасобны—толькі 35

Кантрактацыя тэхкультур у аднаасобным сэктары—пад пагрозай зрыву

Патрэбны рашучы адпор кулаку, які шалёна агітуе за скарачэньне засеву тэхкультур

ЛЕЗНА. Кантрактацыя яравых у Лёзьнянскім раёне праходзіць усё яшчэ нездавальняюча. На калгасах, праўда, закантрактавана 117 проц. пляну пасеву лёну, але зусім дрэнна праводзіцца гэта работа па аднаасобным сэктары. Да гэтага часу не разгорнута вакол кантрактацыі масавая работа сярод беднякоў і сераднякоў. Кулацтва вядзе шалёную агітацыю супроць пасеву лёну і кантрактацыі яго. Кулакі агітуюць за тое, каб беднякі і сераднякі не хадзілі на сходы і гэтым самым імкнуцца сарваць работу па кантрактацыі. Вакол пасеву лёну разгортваецца жорсткая клясавая барацьба. Кулакі агітуюць за тое, каб «сеяць усяго патрошку і тым быць незалежнымі ад дзяржавы». Гэтым яны імкнуцца сарваць павялічэньне плошчы пад лёнам і спэцыялізацыю раёну.

Усяго закантрактавана лёну па аднаасобным сэктары 35 проц.

Але ёсьць і такія сельсаветы, якія па-бальшавіцку вядуць работу па кантрактацыі. Так, па Калышанскім сельсавеце да 10-IV закантрактавана 80 проц. пляну, Чэрніцкім—65 проц. Але ёсьць сельсаветы, якія ганебна цягнуцца ў хвасьце. У Лёзьнянскім сельсавеце закантрактавана 9 проц. пляну, у Горбаўскім—19 проц., Замшынскім—13 проц. і Дабрамысьлянскім—20 проц.

Апарат райвыканкамсаюзу недастаткова мабілізаваны для практычнага правядзеньня кантрактацыі і афармленьня дагавораў. Упаўнаважаныя камсаюзу па правядзеньні кантрактацыі т.т. Агеева і Сенько замест работы і адказнасьці ў адведным сельсавеце, фактычна не працуюць у вызначаных сельсаветах.

Пасылка брыгад з раённага цэнтру ў сувязі з правядзеньнем генэральнай праверкі дапамагла атрымаць некаторы зрух у справе кантрактацыі з (1-IV па 10-IV выкананьне пляну ўзьнялося з 9 да 35 проц.), аднак, гэтыя тэмпы яшчэ ня могуць задаволіць. Патрэбны яшчэ больш рашучыя меры для таго, каб поўнасьцю выкананць плян кантрактацыі.

Р—а.

Удзесяцярыць тэмп кантрактацыі лёну і канапель

Да наступленьня веснавой сяўбы засталося вельмі мала часу; ён вызначаецца днямі. У гэты кароткі прамежак часу раённыя партыйныя арганізацыі і выканкомы павінны выкананць дырэктывы партыі і ўраду па стварэньні сыравінай базы для нашай прамысловасьці, пашырэньні пасеваў плошчы тэхнічных культур і кантрактацыі.

Вынікі кантрактацыі тэхнічных культур (лёну і канапель) па БССР у аднаасобным сэктары на 15-IV гаворадзь аз зрыў гэтай гаспадарчай - палітычнай кампаніі. Першай прычынай гэтага галоўным чынам, зьяўляецца тое, што вакол адозвы ЦК і СНК, вакол тых мерапрыемстваў, якія намечаны партыяй і ўрадам у гэтай адозве, бядняцка - серадняцкая маса раённымі арганізацыямі не мабілізавана і яна ў большасьці сваёй аб іх ня ведае.

Другая прычына, апартуністычная недаацэнка значэньня кантрактацыі і разьлікі на самацёк.

У гэтыя лічаныя 5-10 дзён раённыя партыйныя арганізацыі, раённыя выканаўчыя камітэты, асабліва раённыя органы калгасна-каапэрацыйных сыстэм павінны бездаводна разгарнуць работу па кантрактацыі тэхнічных культур у аднаасобным сэктары з тым разьлікам, каб скончыць іх на ўсе 100 процантаў да вызначанага партыяй і ўрадам тэрміну. У гэты кароткі тэрмін усе сілы, уся ўвага павінны быць згрупаваны на пытаньні кантрактацыі лёну і канапель у аднаасобным сэктары, на пытаньні стварэньня сыравінай базы, на пытаньні забясьпячэньня сыравінай ў 1932 г. лёнаапрацоўваючай прамысловасьці. Органы калгаснай сыстэмы, органы сыстэмы сельска - гаспадарчай каапэрацыі павінны не забываць, што яны за невыкананьне пляну па кантрактацыі нясуць суровую адказнасьць. Невыкананьне пляну па кантрактацыі тэхнічных культур павін на разглядацца як зрыў надыходзячай загатоўчай кампаніі сыравіны для прамысловасьці на 1932 год.

У гэты кароткі тэрмін члены партыі, камсамол, савецкі актыў павінны самамабілізавацца на правядзеньне гэтай важнейшай палітычнай задачы з усёй сур'ёзнасьцю адкінуць розныя разьлічваньні на самацёк.

Правядзеньне гэтых важнейшых палітычных задач павінна быць пабудавана на аснове шырокага растлумачэньня бядняцка - сераднякай масе аб значэньні звароту ЦК і СНК, растлумачэньня таго, што кантрактацыя замацоўвае вытворчы саюз гораду з вёскай. Правядзеньне гэтых важнейшых палітычных задач павінна быць пабудавана на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва і бязьлітаснай барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і «левымі» загібамі.

А. Неўскі.

Старобіншчына павінна падцягнуцца

Кантрактацыя яравых пасеваў на аднаасобным сэктары Старобінскага раёну праходзіць нездавальняюча. На 10 красавіка плян кантрактацыі на раёне выкананы толькі на 60 проц. На некаторых сельсаветах раёну зусім не разгорнута работа па кантрактацыі. Так, у Сухаміньскім і Дашанавіцкім сельсаветах да гэтага часу не закантрактавана ніводнага га. Таксама адстаюць сельсаветы: Капацэвіцкі, які выканаў 44 проц. пляну, Чырвона-Дворскі—46 проц., Дзякавіцкі—46 проц.

У тых сельсаветах, дзе вакол кантрактацыі мабілізавана грамадзкая думка—там кантрактацыя праходзіць больш-менш здавальняюча. Так, Старобінскі сельсавет выканаў плян кантрактацыі на 110 проц., Чыжэвіцкі—87 проц., Пагонкі—87 проц., Лістападавіцкі—80 проц.

На паасобных культурах плян кантрактацыі ў аднаасобным сэктары выкананы: па лёну—91 проц., па бульбе—83 проц.

Лепш абстаіць справа з правядзеньнем гэтага мерапрыемства па калгасах раёну, дзе плян кантрактацыі выканан на 95 проц. З паасобных культур плян выкананы: па лёну—82 проц., бульбе—72 проц., аўсу—100 проц., ячменю—99 проц.

Гр. Шчавель.

На ліквідацыю прарываў

Горацкая Райспажыўтаварыства пераключылася на баявыя рэйкі работы па ліквідацыі маючыхся прарываў па выкананьні ўсіх відаў загатовак.

У час правядзеньня рэарганізацыі клапсеткі, былі наладжаны чырвоныя абозы з лёнам. Так з Каменскага сельсавету 40 падвод прывезьлі лёну ў загатоўчы пункт Райспажыўтаварыства.

Да арганізацыйнага сходу ўпаўнаважаных па выбарах Сельна таксама арганізаваны чырвоны абоз у 15 падвод з лёнам у якасьці падарунка.

Пры Сельпо арганізавана ініцыятарская група па ліквідацыі прарываў у лёназагатоўках. Апроч гэтага на ліквідацыю прарываў у загатоўках мабілізаваны ўсе працаўнікі Райспажыўтаварыства, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі і выклікаюць адзін другога на сацспаборніцтва па ліквідацыі гэтых прарываў.

Райспажыўтаварыствы, бяруце прыклад з Горацкага таварыства!

Селькор Дзед А.

Кулак не абкладзены

Клядзіскі сельсавет атрымаў задань не ад РВК па лёназагатоўках яшчэ ў другой палове 1930 году.

Заданьне гэта ў сельсавеце ляжала да 15 сакавіка 1931 г. і толькі з 15 сакавіка сельсавет распачаў лёназагатоўкі ў той час як лёнавалакно пашло на прыватны рынак і было скарыстана самімі сялянамі на розныя патрэбы.

З кулакоў яшчэ можна было ўзяць лён, але сельсавет, лічыць, што ўжо ў сялян няма лёну, не абклаў цьвёрдымі заданьнямі кулакоў.

Глускаму РВК патрэбна прыцягнуць Клядзіскі сельсавет да адказнасьці за зрыў лёназагатовак.

Бачыўшы.

Чарапашыя тэмпы

У Старасельскім сельсавеце слаба праходзяць лёназагатоўкі. Плян па лёназагатоўках выкананы на 60 проц. Значна тармозяць у гэтым пытаньні загатоўчыя пункты.

Райкалгассаюз амаль ніякага ўдзелу ня прымае ў лёназагатоўках.

Кулацка-заможныя гаспадаркі не выконваюць сваіх заданьняў, а сельсавет ня прымае належных крокаў да спагнаньня гэтых заданьняў.

У сельсавеце маецца прарыў па лёнакантрактацыі.

Трэба адзначыць, што апроч таго, што плян кантрактацыі лёну выкананы, плошча пасеву вельмі мізэрная. Некаторыя калгасы прынялі планы пасеву лёну, але насеньня ў іх няма.

Брыгадзір «Сав. Бел.» Генін.

Сваячасова падрыхтавацца да мэханізаванай уборкі лёну

Адначасова з правядзеньнем веснавой сяўбы неабходна дакладна падрыхтавацца да правядзеньня асеньняй ўборачнай кампаніі. Асабліва сур'ёзнай падрыхтоўкі вымагае ўборка такой працаёмкай культуры як лён.

Пры значным пашырэньні агульнай пасеўнай плошчы пад лёнам у БССР (у 1931 годзе 240 тысяч га) і росту пасеўнай плошчы ў абапуленым сэктары сельскай гаспадаркі, пытаньню арганізацыі ўборкі лёну і ў прыватнасьці мэханізацыі яе, трэба ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу.

Ручное цераблеьне лёну зьяўляецца, як паказвае практыка, адным з самых вузкіх месц пры пабудове і арганізацыі буйных спэцыялізаваных ільна водных гаспадарак. Ні саўгасы, ні калгасы ў мінулым годзе ня справіліся здавальняюча з гэтай задачай.

Для атрыманьня дабраякаснай сыравіны для нашых ільняных фабрык лён трэба ўбіраць у перыяд жоўтай спеласьці, тады атрымліваецца найвышэйшы выхад і лепшая якасьць валакна. Таму ўбіраць лён трэба вельмі хутка (у працягу некалькіх дзён) інакш ён нерастоіцца, абясцэньціцца тавар-валакно, а галоўкі абсыпяцца.

Пры вялікіх плошчах, перавышаючых сотні і тысячы га, намечаных да засеву ў апрамаджаных гаспадарках у 1931 годзе, для ўборкі лёну патрабуецца вялікая колькасьць рабочай сілы ў кароткі пэрыяд уборкі лёну.

Бясспрэчна, што ў сувязі з вялізарным размахам будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ў Савецкім Саюзе ў час уборкі лёнасаўгасы і лёна калгасы будуць востра адчуваць недахват у рабочай сіле. Таму неабходна ў найкарацейшы тэрмін абавязкова дабіцца мэханізацыі працэсаў ільнаводзтва і асабліва цераблеьня лёну.

Партыя і ўрад аддаюць гэтаму пытаньню выключную ўвагу. У сэзон 1930 г. у Савецкі Саюз было ўвезена з-за межаў 300 лёна-цераблеьных машын бэльгійскага канструктара Суцэна. Але ўсё-ж гэтыя машыны былі далёкі ад удасканаленьня і як паказаў масавы вопыт іх ужываньня ў саўгасах, на вопытных станцыях і часткова ў калгасах, яны маюць цэлы рад канструкцыйных і тэхнічных дэфэктаў.

Мы маем пастанову партыі і ўраду аб выробе на нашых заводах сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва ў сэзон 1931 году дзесяці тысяч лёнацераблеьных машын.

Выканаць сацыялістычны заказ пра мысловасьці для апрамаджанага ільна водзтва ўзяў на сябе Любарэцкі завод імі выробляе складаныя ўборачныя с.-г. машыны: касілкі, жнейкі, снапавязалкі.

Але з прычыны выяўленых дэфэктаў у лёнацераблеьцы Суцэна пастановы лена было, улічыўшы гадавы вопыт мінулай уборачнай кампаніі, перакантруіраваць цераблеьку Суцэна. Для гэтага Галоўлёнкомам была скліканна ўвосень мінулага году спэцыяльная нарада, прысьвечаная пытаньням вынікаў работы цераблеькі Суцэна і адшуканьня спосабаў яе ўдасканаленьня.

Гэта нарада дала багаты матар'ял усебакова асьвятляўшы работу машыны Суцэна і ў асноўным намецила спосаб яе ўдасканаленьня.

Такім чынам, прынятая да вырабу, мадэль лёнацераблеьнай машыны значна ўдасканалена ў параўнаньні з машынаю Суцэна.

У сучасны момант першая машына вынушчаная Любарэцкім заводам с.-г. машын выпрабоўваецца ў лябораторнай абстаноўцы. Пасьля выпрабаваньня і паправкі выяўленых недахопаў, перш чым пусьціць машыну для масавага выробу, яна будзе выпрабавана ў маі месяцы на ўборцы лёну на спэцыяльна для гэтай мэты пасеяным участку ў Закаўказьзі, каб праверыць машыну ў палявой абстаноўцы і мець большую гарантыю яе прыгоднасьці на буйных ільняных палёх нашых лёнасаўгасаў і лёнакантрасаў.

Паводле пляну ўраду да ўборкі лёну завод павінен будзе выпрацаваць 4500 штук цераблеьных машын, якая колькасьць дасьць магчымасьць поўнасьцю, на ўсе 100 проц. мэханізаваць уборку лёну ў лёнасаўгасах і на 65 процантаў у калгасах.

Для поўнага посьпеху мэханізацыі ўборкі лёну неабходна, каб да выкананьня вытворчага заданьня як колькасна, так асабліва ўякасных паказьнікаў была прыцягнута ўся партыйная і савецкая грамадзкасьць.

Адначасова на долю кіраўнікоў і арганізатараў лёнасаўгасаў, МТС, лёна калгасаў ускладаецца вялізарная адказная задача падрыхтаваць сваячасова кадры для ўмелых і беражлівых адносін да дарагіх і такіх неабходных машын.

Неабходна абавязкова дабіцца зьнішчэньня агіднага зьявішча меўшага месца ў мінулым годзе, калі з-за непадрыхтаванасьці кіраўнікоў гаспадарак і рабочых машыны не выкарыстоўваліся, або эксплёатаваліся безгаспадарча, нядбайна, у выніку—ліцнія прастоі, паломкі, прарывы ў рабоце.

Неабходна прымацаваць трактарыстаў да машын, павялічыць адказнасьць за паломкі, арганізаваць ударніцтва і сацспаборніцтва пры ўборцы лёну ня толькі па колькасьці прыбранай плошчы, але і па якасных паказьніках стану машын.

Р. Меерсон.

Скрыўляецца клясавая лінія

У Сьвісланскім раёне яшчэ няма адпаведнага пералому ў выкананьні пляну лёназагатовак.

Трэба адзначыць, што магчымасьці да поўнага выкананьня лёназагатовак ёсьць, але сельсаветы яшчэ не павярнуліся тварам да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Маюцца выпадкі калі цьвёрдыя заданьні па лёназагатоўках даюцца маламоцным серадняцкім гаспадаркам, а кулацка-заможным не даецца. Кулакі распрадаюць лён замест таго, каб ягоздаць дзяржаве.

Камсамольскія арганізацыі прымаюць зусім слабы ўдзел у гэтай кампаніі. Ёсьць такія ячэйкі, якія нават гэтага пытаньня не абгаварвалі на агульных сходах, не гаворачы ўжо аб іх практычным удзеле.

Брыгада: «Савецкая Беларусь»
Баршай, Шаліра, Лунін.

У паход за зьдзельшчыну

СКОНЧЫЦЬ У ТЭРМІН

перавод калгасаў і саўгасаў на зьдзельшчыну

Зьдзельшчына ўзмацняе калгас

Колька было раней у калгасе Най Лёзься з працоўнаю дысцыплінаю. Некаторая частка калгасьнікаў зусім не выходзіла на працу, ведаючы, што прыдзе канец года і ўсё роўна яны атрымаюць частку ўраджаю, як усе іншыя члены калгасу. Гэтак было да ўвядзеньня зьдзельшчыны. Зьдзельшчына-ж моцна ўдарыла па ґультаёх і тых, хто ўхіляўся ад працы. Цяпер калгасьнікі самі просяць працы ў праўленьня.

Пераход на зьдзельныя нормы выпрацоўкі даў вялізарнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы. Калі раней за дзень вывазілася па 5—6 вазоў гною, дык цяпер, пры норме ў 10 вазоў, гэтая норма ня толькі выконваецца, але і перавыконваецца на 30—40 процантаў (вывозіцца 13—14 вазоў гною за дзень).

Раней для абслугоўваньня жывёлы было прыстаўлена на кожныя сто галоў 5 чалавек. Пасьля пераходу на зьдзельшчыну з гэтаю работаю пасьпяхова спраўляюцца тры калгасьнікі. Па перавозцы бульбы выпрацоўка павялічылася на 50 процантаў супроць той выпрацоўкі, якая была да пераходу на зьдзельшчыну.

Зьдзельшчына стварыла сярод калгасьнікаў вялізарнейшую зацікаўленасьць у працы. Жанчыны-калгасьніцы паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы ў працы. Раней 6—7 жанчын ачышчалі насеньня за дзень 100 пудоў. Цяпер-жа, пры пераходзе на зьдзельныя нормы, калгас устанавіў для 3 жанчын норму ў 180 пудоў збожжа за дзень. На справе-ж гэтыя тры жанчыны ня толькі спраўляюцца з выкананьнем нормы, але і даюць перавышэньне яе, даводзячы выпрацоўку да 250—240 пудоў за дзень.

Зьдзельшчына зусім зьнішчыла працгулы. Калгасьнікі дабраахвотна заяўляюць аб прыняцьці на сябе дадатковай нагрузкі па працы ў калгасе. Так, калгасьнікі, якія прымацаваны для догляду коняй, узялі на сябе ў якасьці дадатковай нагрузкі догляд і сьвіней.

Пры пераходзе на зьдзельшчыну ў калгасе, які мае толькі 17 сем'яў, выявілася значная колькасьць рабочае сілы, якая раней скарыстоўвалася нерацыянальна. Калгасам прадвідзена разбіўка на брыгады. Усе галіны працы пераведзены на зьдзельшчыну. Калгасьнікі адабраюць гэтае мерапрыемства, як накіраванае на ўздым калгаснае гаспадаркі і дабрабыту саміх калгасьнікаў праз правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў калгасу:

Зьдзельшчына будзе спрыяць новаму прыліву ў калгасы бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Брыгада «Сав. Бел» Дамброўскі, Цырлін.

Зьдзельшчына павінна быць у кожным калгасе

БАБРУЙСК, 17-IV. (Наш кар.). 11 красавіка адбылася раённая нарада старшынь калгасаў па пытаньні ўвядзеньня ў калгасах зьдзельшчыны. На нарадзе, апрача дакладу па гэтым пытаньні, калгасы раёну, якія ўжо да гэтага часу ўвялі ў сябе зьдзельшчыну, дзялісьліся вопытам сваёй працы.

Пытаньне аб увядзеньні зьдзельшчыны было шырока абгаворана ўдзельнікамі нарады. Прычым усе выказаліся за неадкладнае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі і ўраду аб увядзеньні зьдзельных норм і расцэнак.

Нарада вырашыла, што да гэтага часу пытаньню ўвядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах з боку райкалгассаюзу не аддавалася належнай увагі, зьдзельшчына ўведзена толькі ў 3—4 калгасах і не па ўсіх галінах працы.

Нарада пастанавіла прыняць усе меры к таму, каб зьдзельшчына была ўведзена ва ўсіх калгасах раёну.

Вялікую увагу нарада аддала пытаньню абмену вопытам сярод калгасаў па ўвядзеньні зьдзельшчыны. Гэтая работа будзе праводзіцца праз калгасьнікаў «65 тысячнікаў», нарады, даклады і г. д.

Пастанова нарады павінна прымусіць райкалгассаюз, які да гэтага часу амаль што не кіраваў увядзеньнем зьдзельшчыны, пайсьці на дапамогу калгасам, накіраваўшы ў калгасы сваіх працаўнікоў для ўстанаўленьня норм і расцэнак. Большасьць калгасаў самі з гэтай работай ня справяцца.

Д. Аланскі.

Зараз-жа аздаравіць калгас „Клімаўшчына"

Жалезнай мятлой усё варожае з калгасу

У калгасе «Клімаўшчына», Баркавіцкага раёну і сельсавету, пануюць вялікія непаладкі. Падрыхтоўка да сяўбы не вядзецца, дагляд за жывёлай вельмі дрэнны. Ад недагляду загінула 12 цялят. Працоўная дысцыпліна ў калгасе адсутнічае.

Такое цяжкае становішча стварылася ў выніку таго, што калгас засьмечаны варожым элемэнтам. Старшыня праўленьня калгасу Ганчарык—сын кулака,—бацькі яго плаціць падатак у індывідуальным парадку. Намесьнік старшыні і аднаго члена праўленьня за безгаспадарчасьць нядаўна прысудзілі на 6 месяцаў прымусовых работ. Ня гледзячы на гэта, да апошняга часу яны ня выдалены са складу праўленьня. Сярод членаў калгасу ёсьць кантрабандысты і пазбаўленцы. Нядаўна адбылася чыстка калгасу, але яна не закранула ўсіх варожых і чужых элемэнтаў.

У калгасе ня скончана яшчэ разьмеркаваньне ўраджаю. Некаторыя члены калгасу ўжо тры месяцы як не атрымліваюць прадукты. У выніку такіх адносін з боку праўленьня калгасу, зьнижаецца працоўная дысцыпліна ў калгасе.

Ячэйка ЛКСМБ бязьдзейнічае і ніякай работы не вядзе. Напрыклад, 9 красавіка адбыўся сход ячэйкі, на якім ставілося пытаньне аб пасеўнай кампаніі, але сход нічога ня вырашыў, бо амаль усе ўдзельнікі сходу спалі.

Ячэйка КП(б)Б Дарстрою 5 Дыстанцыі ўзяла шэфства над калгасам, але нічога канкрэтнага не зрабіла, каб наладзіць у ім работу. Нядаўна прыяжджаў у калгас прадстаўнік ад ячэйкі тав. Сьвірка. Чым-жа дапамог гэты таварыш калгасу ў падрыхтоўцы да сяўбы? Замест таго, каб перш за ўсё ўзяцца за аздараўленьне калгасу, за падрыхтоўку да веснавой сяўбы, тав. Сьвірка пачаў з таго, каб яму адраманцавалі добрую кватэру.

Партыйныя, савецкія, калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі раёну павінны зараз-жа правесьці аздараўленьне калгасу «Клімаўшчына». Жалезнай мятлой трэба вычысьціць з яго ўвесь чужы варожы элемэнт. Неабходна зьнішчыць усе перашкоды, якія зрываюць падрыхтоўку да сяўбы калгасу.

С—р.

Удзельшчына

Лёзься з працоўнаю дысцыплінаю. Некаторая частка калгасьнікаў зусім не выходзіла на працу, ведаючы, што прыдзе канец года і ўсё роўна яны атрымаюць частку ўраджаю, як усе іншыя члены калгасу. Гэтак было да ўвядзеньня зьдзельшчыны. Зьдзельшчына-ж моцна ўдарыла па ґультаёх і тых, хто ўхіляўся ад працы. Цяпер калгасьнікі самі просяць працы ў праўленьня.

Пераход на зьдзельныя нормы выпрацоўкі даў вялізарнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы. Калі раней за дзень вывазілася па 5—6 вазоў гною, дык цяпер, пры норме ў 10 вазоў, гэтая норма ня толькі выконваецца, але і перавыконваецца на 30—40 процантаў (вывозіцца 13—14 вазоў гною за дзень).

Раней для абслугоўваньня жывёлы было прыстаўлена на кожныя сто галоў 5 чалавек. Пасьля пераходу на зьдзельшчыну з гэтаю работаю пасьпяхова спраўляюцца тры калгасьнікі. Па перавозцы бульбы выпрацоўка павялічылася на 50 процантаў супроць той выпрацоўкі, якая была да пераходу на зьдзельшчыну.

Зьдзельшчына стварыла сярод калгасьнікаў вялізарнейшую зацікаўленасьць у працы. Жанчыны-калгасьніцы паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы ў працы. Раней 6—7 жанчын ачышчалі насеньня за дзень 100 пудоў. Цяпер-жа, пры пераходзе на зьдзельныя нормы, калгас устанавіў для 3 жанчын норму ў 180 пудоў збожжа за дзень. На справе-ж гэтыя тры жанчыны ня толькі спраўляюцца з выкананьнем нормы, але і даюць перавышэньне яе, даводзячы выпрацоўку да 250—240 пудоў за дзень.

Зьдзельшчына зусім зьнішчыла працгулы. Калгасьнікі дабраахвотна заяўляюць аб прыняцьці на сябе дадатковай нагрузкі па працы ў калгасе. Так, калгасьнікі, якія прымацаваны для догляду коняй, узялі на сябе ў якасьці дадатковай нагрузкі догляд і сьвіней.

Пры пераходзе на зьдзельшчыну ў калгасе, які мае толькі 17 сем'яў, выявілася значная колькасьць рабочае сілы, якая раней скарыстоўвалася нерацыянальна. Калгасам прадвідзена разбіўка на брыгады. Усе галіны працы пераведзены на зьдзельшчыну. Калгасьнікі адабраюць гэтае мерапрыемства, як накіраванае на ўздым калгаснае гаспадаркі і дабрабыту саміх калгасьнікаў праз правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў калгасу:

Зьдзельшчына будзе спрыяць новаму прыліву ў калгасы бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Брыгада «Сав. Бел» Дамброўскі, Цырлін.

За ўдарныя тэмпы

3078,1 тоны насеннай бульбы—

вось баявое заданьне адгрузкі на кожны дзень

Мы адгружаем толькі 16 тон

Зводка адгрузкі бульбы за 17 красавіка

Паводле вестак Белсадгародніны, Белкаапсаюзам адгружана насеннай бульбы для Украіны—16 тон.

Гэта—ганэбна мізэрная лічба ў параўнаньні з колькасьцю, якую трэба адгружаць штодня, каб забясьпечыць адгрузку насеньня ў тэрмін, паказаны СНК БССР—25 красавіка.

Поруч з гэтым, адгружана сталовай бульбы для пралетарскіх пэнтраў Белкаапсаюзам 178,2 тоны і Беллёнасаюзам 121,8 тон. Усёй-жа бульбы абедзьвума сыстэмамі за дзень адгружана 316 тон. Лічба, бязумоўна, нізкая.

Калі такімі тэмпамі Белкаапсаюз і Беллёнасаюз будуць працаваць і надалей, дык ёсьць пагроза, што яны сарвуць сваячасовую адгрузку бульбы.

Раённы друк павінен уключыцца ў сацспаборніцтва па бульбазагатоўках

Пасеўная, Менск, «Сав. Бел.».

Рэдакцыя газэты «Камунар» уключаецца ў сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавых бульбазагатовак. Даны паказаньні ўдарным брыгадам і рабселькорам. Арганізуем ударныя пасты нагляду за адгрузкай бульбы.

Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу газэты «Віцебскі Пралетары», «Палеская Праўда», «Камуніст», «Ленінскі Шлях», «Ленінскі Прызыў», «Чырвоная Палаччына», «Ударнік Койданаўшчыны» і «Камуна».

Рэдакцыя газэты «Камунар» (Рагачэў).

Да 25 красавіка адгрузіць вызначаную плянам бульбу

БССР, праз сыстэмы спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі, адгружае ў сёлетнюю весну 61600 тон сталовай і насеннай бульбы для Ленінграду, Масквы і Украіны. З гэтае колькасьці 39.900 тон трэба адгрузіць сталовай бульбы для спажываньня і 21.700 тон насеннай бульбы для сяўбы.

На сёньняшні дзень абедзьвума сыстэмамі сталовай бульбы адгружана 3,3 проц. заданьня, або 1327,1 тон, а насеннай 153,6 тон, або 0,7 проц. заданьня.

Галоўны цяжар па загатоўцы бульбы прыпадае на Белкаапсаюз, які павінен адгрузіць насеннай бульбы 17,100 тон, а адгрузіў усяго 109 тон, або 0,6 проц. заданьня. Сталовай бульбы трэба адгрузіць 36750 тон, адгружана-ж 1152,3 тоны, або 3,1 проц. пляну.

Засталося яшчэ адгружаць насеннай бульбы 16,091 тону, а ў спажывецкай бульбы—35,597,7 тон.

Паводле пастановы СНК

Аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

З рэзалюцыі сходу актыву менскай гарадзкой партарганізацыі

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад т. **Галаздзеда** аб выніках аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, сход актыву менскай гарадзкой партарганізацыі поўнасцю ўхваляе і далучаецца да пастаноў пленуму.

КП(б)Б, пад бальшавіцкім кіраўніцтвам свайго ЦК і ЦК УсеКП(б), вядучы рабочыя і беднацка-серадняцкія масы на шляху сацыялістычнага наступлення на капіталістычныя элементы па ўсім фронце, перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага, бязьлітасна змагаючыся на два фронты, скасавуючы галоўны ўдар па найбольш небясьпечным на даным этапе правым ухіле, забясьпечыла шпаркае разьвіцьцё індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Побач з шпаркім разьвіцьцём індустрыі, якая адыгрывае вядучую ролю ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, усё вышэй узьнімаецца шырокая хваля калгаснага руху. Беднацка - серадняцкія масы рашучна павярнулі на шлях калектывізацыі. За раз у радзе раёнаў БССР калектывізацыя даведзена да 30 проц., з некаторых раёнаў калектывізаваны больш чым на 50 проц. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму на вёсцы—кулацтва як кляса. У асобе калгаснікаў партыя і сав. улада атрымалі моцную апору на вёсцы.

Разам з гэтым актыў падкрэсьлівае зусім правільнае занастрэньне Пленумам увагі ўсёй КП(б)Б на задачах узмацнення тэмпаў работы па калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы таму, што процант калектывізацыі (21,8 на 5-е красавіка) і стан работы па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны застаюцца на сёнешні дзень недавальняючымі. БССР значна адстае ў справе калектывізацыі ў параўнаньні з радам іншых абласьцей і рэспублік. Недапушчальнае адставаньне многіх раёнаў у калгасным будаўніцтве тлумачыцца слабай пастаноўкай масавай работы па арганізацыі калгаснага прыліву, невыстарчальнай барацьбой у радзе раёнаў з кулацкімі элементамі, наяўнасьцю ў радзе зьяўленьняў КП(б)Б права-апартуністычнай практыкі і момантаў «левых» перагібаў у разгортваньні калгаснага руху, у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній (кантрактацыя, пераход калгасаў на зьдзельшчыну, ліквідацыя абязьлічкі і т.д.).

Актыў лічыць, што ліквідацыя прарываў у рабоце па выкананьні бальшавіцкай праграмы другой калгаснай вясны патрабуе сапраўдных ударных тэмпаў работы ўсёй партыйнай арганізацыі па рэалізацыі пастановы Пленуму, шырокай мабілізацыі мас на перамаганьне кулацкага супраціўленьня, на бязьлітасную барацьбу з апартунізмам у розных яго праявах. Цэнтральнай задачай на ўсёй падрыхтоўчай рабоце да веснавой сяўбы павінны быць арганізацыя новага калгаснага прыліву і мерапрыемствы па гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Зараз, калі перад кожным бедняком і серадняком—аднаасобникам стаіць пытаньне «за, ці супроць калгасаў», партыйныя арганізацыі сваёй работай павінны забясьпечыць дапамогу беднаку і серадняку—аднаасобніку хутчэй стаць на «шлях дапамогі калгасу, а потым і ўступленьня ў яго». Правядзеньне другой калгаснай вясны зьяўляецца генэральным экзаменам для ўсёй КП(б)Б, экзаменам яе баяздольнасьці змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Сход партактыву адзначае вялікія дасягненьні КП(б)Б у справе ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі партыі. Няўхільна праводзячы ленінскую лінію ў нац. пытаньні, змагаючыся за будаўніцтва нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце культуры, КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, рашуча ачышчала і ачышчае свае рады ад нацыянал - апартуністычных элементаў—агентуры беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, выкарчоўвала бюрпрыцыдную групоўшчыну, мабілізавала шырокія пралетарскія працоўныя масы на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускай нац. дэмакратызмам, польскім, яўрэйскім і інш. шавінізмамі.

Лічачы зусім неабходным весьці і ў далейшым непачадную барацьбу з усімі правямі нац. дэмакратызму, гэтай прамой агентурай польскага фашызму, з усімі магчымымі новымі формамі барацьбы выкрытага нац. дэмакратызму, актыў падкрэсьлівае зусім правільнае канстатаваньне Пленуму аб сталітынай небясьпецы спрашчэньня, адмаўленьня нацыянальнай формы і недаацэнкі нац. пытаньня наогул, што вядзе фактычна да скочваньня на пазыцыі вялікадзяржаўнаа шавінізму».

Задачы далейшага правядзеньня нацыянальнай палітыкі партыі павінны вызначацца тым, што вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, што далейшая барацьба за «перамаганьне на цыянал - дэмакратызму» і нацыянал-апартунізму павінна ісьці па лініі яшчэ большага ўзмацненьня і разгортваньня работы па будаўніцтве культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, і ўзмацненьня работы па беларусізацыі». Работа па ўзмацненьні інтэрнацыянальнага выхаваньня мас, зьяўляецца важнейшай зарукай пасьпяховага перамаганьня шавінізмаў розных колераў.

Партактыў заклікае ўсю менскую гарадзкую партарганізацыю ўзмацніць працу на прадпрыемствах па добраахвотным уцягненьні рабочых мас у работу па беларусізацыі, узмацніць работу ўсіх ячэек у справе практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў кастрычніцкага Пленуму ЦК КП(б)Б па нац. пытаньні.

Сход партактыву лічыць, што выкананьне грандыёзных задач, вызначаных партыяй на 3-ці рашаючы год пяцігодкі, патрабуе напружаных тэмпаў работы ўсіх зьвяньняў КП(б)Б, на вялічэньня клясавай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, больш шырокага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, як важнейшай зброі барацьбы з апартуністычнымі і бюракратычнымі скажэньнямі партыйнай лініі.

Партактыў поўнасьцю ўхваляе рашэньне Прэзыдыуму ЦККК УсеКП(б) па справе беларускіх нац. дэмаў і рашэньні аб'яднаната Пленуму ЦК і ЦКК па гэтым пытаньні. Партыя, дапамагаючы таварышом, прызнаўшым свае апартуністычныя памылкі, іх выпраўляць, дапамагаючы ім ва ўсёй партыйнай працы, будзе адначасова ўважліва сачыць, як яны на справе выпраўляюць іх і актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе за генэральную лінію партыі і ў яе практычным ажыцьцяўленьні.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК падвёў вынікі ачысткі КП(б)Б ад нацыянал-апартуністычных элементаў і раш так групоўшчыны за пэўны этап, якія перашкаджалі практычнай барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Уся КП(б)Б павінна будзе мабілізаваць усе свае сілы і, пад кіраўніцтвам свайго ЦК павесьці рашучую барацьбу за зьнішчэньне ўсіх прарываў на радзе вучасткаў сацыялістычнага фронту.

Актыў катэгарычна асуджае «лявацкія» наскокі, накіраваныя на дыскрэдытацыю бальшавіцкага кіраўніцтва КП(б)Б у яго барацьбе з нацдэмаратызмам і нац. апартунізмам і заклікае ўсю арганізацыю весьці рашучую барацьбу з гэтымі «лявацкімі» наскокамі.

Партактыў заклікае ўсю партарганізацыю, на падставе дасягнутых вялізарных посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва і выкліканага гэтымі посьпехамі новага ўздыму энтузіязму шырокіх мас рабочых, разгарнуць вялікую работу ў тым напрамку, каб стаць на чале творчай актыўнасьці рабочай клясы і забясьпечыць ліквідацыю прарываў першага кварталу і поўнае выкананьне ўсіх заданьняў, як колькасных, так і асабліва якасных, прамфінпляну 2-га кварталу бягучага году.

Актыў асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць павышэньня адказнасьці кожнага камуніста за даручаную яму справу, якая зьяўляецца часткаю агульнай задачы партыі—пабудовы сацыялізму.

Актыў заклікае ўсю партарганізацыю мабілізаваць свае сілы і ўсю творчую энэргію рабочых мас на ажыцьцяўленьне пастаноў аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, на пасьпяховае завяршэньне ў гэтым годзе пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі краіны.

Гнаць вон шкоднікаў

Апошнімі пленумамі **ЦК** УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б дана практычная праграма барацьбы за перабудову ўсёй каапэрацыйнай сыстэмы, усёй работы каапэрацыі. Ня ўсімі зьвенямі каапэрацыі дырэктыва гэта выконваецца. На практыцы мы наглядаем яшчэ такую работу каапэрацыйнага апарату, якую знаком як працягваньнем шкодніцтва нельга назваць.

Наша задача—мабілізаваць масы рабочых і ўсіх працоўных на хутчэйшае поўнае зжываньне рэшткаў шкодніцтва і рашучае перасекчы далейшыя спробы клясавага ворага стаць поперак шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабселькоры паведамляюць нам абшэрагах фактаў апартуністычнай практыкі, палітычнай блізарукасьці, злоўжываньня ў асобных нізавых зьвенях каапэрацыі, якія па сутнасьці перарастаюць у шкодніцтва і гэтым самым льюць ваду на млын клясавага ворага.

***

У Старасельскай каапэрацыі (Копыс кага раёну) загадчыкам зьяўляецца падкулачнік Я. Каласоўскі. Замест таго, каб дэфіцытны тавар адпускаць бяднаце, ён адпускае заможнікам. Каласоўскі штодзенна п'янствуе. Старшыня Праўленьня сельскага спаж. т-ва Разэнман бязьдзейнічае.

Брыгада «С. Б.» У. А. Р.

У Маркавіцкай краме (Церахоўскага раёну) спажыўтаварыства згрупавалася цёплая сямейка, якая разьмяркоўвае дэфіцытныя тавары паміж сабою. Вось яна: Верашэка Цімох—сын заможніка, Вераб'ёў Тодар, Макарэнка Яўхім, Булахоў Янка, Сарока Барыс і інш. хлебазагатоўкі і загатоўка тэхкультур прайшла за кошт бяднаты і серадняцтва вёскі.

Востры.

У Расьнянскім раёне, група адказных працаўнікоў бярэ выключна сабе некаторыя дэфіцытныя тавары, а рабочым, калгаснікам і бяднаце нічога не даюць.

Юнкор.

Ва ўсіх крамах Буда-Кашалёўскай каапэрацыі ўсе дэфіцытныя тавары прадаюцца выключна групе адказных працаўнікоў,—і больш нікому.

Д. Круглякоў.

У сталоўцы ў Азарачах хлеб разбазаравецца. У сталоўцы працаваў ліцэнец, які цэлыя булкі браў на кватэру. Райінструктар **Фрэйнклах** атрымаў у сталоўцы 121 кгр. мукі. Наогул тут існуе бесгаспадарчасьць.

Ліўшыц.

Глускія каапэратары паслалі ў Жалвінацкае аддзяленьне для дарослых 38—39 нумар абутку. Такія-ж факты ёсьць і з вопраткай і бялізнай, калі дарослым даюць дзіцячы разьмер, а дзецям—вялікі. Тут ніякай работы няма па мабілізацыі сродкаў.

В. Мішур.

На чале **Дрыбенскага Райкаапсаюзу** знаходзіцца т. Кавальчук, які бюракратычна адносіцца да работы. Ён ня ведае колькі ў раёне першапачатковых таварыстваў, ня ведае колькі наявых узносаў і г. д.

Для таго, каб грошы паступалі,—Кавальчук зрабіў наступнае: калі да яго прыйшлі з вёскі Галалобаўка за газай, дык ён сказаў, што газа—дэфіцытны тавар і таму таварыства, якое ўнесла грошы можа атрымаць цэлую бочку газы. Члены т-ва сабралі 60 р. за бочку газы і прынесьлі Кавальчуку. Тады ён адказаў, што адну бочку адпусьціць ня мока, а трэба ўзяць 8 бочак.

Праз некалькі дзён сяляне, сабраўшы грошы пайшлі за 8 бочкамі газы. Ён даў пісьмо ў спажыўтаварыства. Але там це адпусьцілі газы, бо няма распараджэньня і таму, што раён наогул зусім мала газы атрымаў. Гэтая правакацыя зроблена для таго, каб сяляне, даведаўшыся аб тым, што ёсьць газа (а на справе яе няма), несьлі пай. Гэта проста ашуканьне сялян.

Д.

Старшыня Сэльна-Тарашынскага с-с **(Амсціслаўскага** раёну) Дубікоўскі зусім ня цікавіцца работай каапэрацыі.

Нікалаеў.

З-за галавацяпства некаторых работ нікаў **Любанскага** спажыўтаварыства было некалькі выпадкаў, калі рабочыя асталіся без абеду.

Вока.

Лёзьнянскае спажыўтаварыства да сяўбы завезла 50 скрынак... розных відаў фарбаў замест неабходных тавараў. Для таго, каб пазбавіцца ад фарбаў, апошнія даюць у дадатак да дэфіцытных тавараў. РСГ трэба на гэта зьвярнуць увагу, бо такім чынам тавар удараецца ў некалькі разоў.

Канырын.

У Круглянскім раёне прыказчыкі спажывецкай крамы м. Круглае, Раўганскай, Глыбоцкай, Цяцерынскай, Паўлавецкай крам перапрадаюць дэфіцытныя тавары на прыватны рынак. Крамныя камісіі не працуюць

Б.

Праўленьне **Самахвалавіцкай** спажыўкаапэрацыі тавар адпускае па пратэкцыі: па пісульках членаў праўленьня і г. д. Прыказчык Канапацкі Васіль пры ліквідацыі раёну, раздаў сваякам шмат дэфіцытных тавараў з фонду прызначанага для возчыкаў каменьня. Ён зрабіў і шараг іншых праступкаў. Трэба за гэта сурова пакараць.

Лёгкі Кавалерыст.

Лельчыцкае райспажыўтаварыства працуе ў пустую. Бухгальтэрыя работае дрэнна. Загадчык райбазы Чухман з умыслам, **шкодніцкі** разьмяркоўвае тавары, вось чаму, у адных мясцох залежы, а ў другіх—недахоп.

Х—Г—н.

Абчугская каапэрацыя сыстэматычна абкрадалася загадчыкам крамы Ахраменкай, з крамы зьнікла 250 мтр. мануфактуры, дзесяткі пудоў газы, мыла і г. д.

Пры вобыску ў Ахраменкі знайшлі шмат грошай. Грошы не канфіскавалі. Міліцыя ня ўжыла ніякіх мер да растратчыкаў. А Ахраменка цяпер сьмяецца над даверлівасьцю мясцовых органі заный.

А.—скі.

Крамнік Залупада спажыўтаварыства Бахаўчук павышаў цэны на тавары, а розьніца ішла яму ў кішэню. Ня гледзячы на яго зладзействы Райспажыўтаварыства паслала яго на курсы, адкуль ён кудысьці ўцёк.

Каратке́віч.

У Сьвіславіцкі раён атрымана 40 партфэляй на 560 руб., якія там зусім не патрэбны. Нядаўна на адрас Сьвіславіцкай каапэрацыі было дасланa 15 вагонаў солі. Што гэта галавацяпства ці шкодніцтва?

Н. Гарэшкі.

У Старасельскай каапэрацыі (Копысь) знайшоў прытулак падкулачнік Янка Каласоўскі. Дэфіцытныя тавары ён адпускае сваяком і заможнікам. Гнаць такога загадчыка з каапэрацыі ная крамы!

Брыгадзір «С. Б.» Г—н.

У Дрычэнскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, у каапэрацыю прадез быўшы эпэмпаі, Фэльман. Ён і яго бацька былі лішаны права голасу. Зараз Фэльман па ініцыятыве старшыні Дрычаўскага сельсавету Кавальчука А. накіраваны ў каапэрацыю, дзе ўжо прабыў год. Фэльман займаецца разьмеркаваньнем драмтавараў сярод сваё радні і кулацтва.

Штурм.

Райкаптаварыства Гароцкага раёну зусім няправільна разьмеркавала тавары паміж крамамі. Так, у студэнцкую краму накіравалі хамуты.

Кравецкая майстэрня рабіць паліты з рукавамі розных даўжыні і шырыні. Новаму Праўленьню райсаюзу трэба хутка ўзяцца за выпраўленьне намылак, якія мелі месца ў рабоце старога праўленьня.

А. В.

У Вабалоўскім с-с, Расьнянскага раёну, загадчык крамы Наказаленка прэміруе прамтаварамі тых, хто атрымаў цьвёрдае заданьне. Таксама тавары выдае сваяком. Тавар для прэміраваньня прадае па дарагой цане.

Падаронны.

У Старасельскай спажыўкаапэрацыі (Копыскі раён) існуе смурод, гразь. У муцэ знойдзена насеньне і іншыя рэчы. Наогул у каапэрацыі адсутнічае санітарнае становішча.

Зоркі.

Месяцамі Баркавіцкая каапэрацыя не выдае жытняй мукі рабочым і служачым. Між тым на ст. Баркавічы ляжыць вагон мукі для пайнікаў, але гэтую муку не рэалізуюць.

Энцін.

Апартуністычная бязхрыбетнасьць на асобных работніках каапэрацыі—вось што зьяўляецца віной такога становішча, якое палана вышэй ў шэрат фактаў, дапісаў нашых рабселькораў.

Вось чаму найпаў задачай зьяўляецца мабілізацыя шырокіх мас рабочых і ўсіх працоўных на барацьбу з рэшткамі шкодніцтва ў каапэрацыі, на барацьбу з апартунізмам, які окрыўляе нашу лінію ў рабочым спажыўзе.

Апошнія пленумы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б далі практычную праграму перабудовы каапэрацыі. Ажыцьцяўленьне гэтай праграмы наша неадкладная задача.

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАГА РЭЙСУ

Ударнікі заводу „Рухавік Рэвалюцыі" дапамагаюць Гомельскім воднікам падрыхтавацца да навігацыі 1931 г.

Замацаваць посьпехі аўралу

Гомельскае Дзяржпараходзтва ня мае транфінпляну.

Гомельскі рачны транспарт выканаў дырэктыву партыі аб падрыхтоўцы да навігацыі. Флёт да першага рэйду гатовы. Перабудавана і партыйная работа. На плавучым складзе судноў створана сетка парт'ячэек, заканчваецца арганізацыя судавых камандаў. Пры кожным судноме арганізуецца насьцен газэта і таварыскі суд. Скончана афар ніленьне параходных камандаў. Ёсьць думка аб арганізацыі на кожнай адзіным самастойных брыгад з трыццаці камі.

Рамонт суднаў скончалы датэрмінова. Гэты быў добры вурок ударнай масавай работы. Тыя тэмпы, тая арганізаванасьць, якія маюцца зараз у партыйных і прафесыянальных воднікіх арганізацый, даюць права спадзявацца на добрыя перспэктывы на навігацыі ў гэтым годзе.

Але ёсьць факты, якія могуць праваліць навігацыю. Гэта датычыцца кіраўніцтва Дняпро-Дзьвінскага параходзтва ў Магілеве

Гэтае кіраўніцтва, ня гледзячы на ўсе абяцаньні, не дало і не дае трамфінпляну на навігацыю 1931 г. Кіраўнік Мурашоў піша ў Гомель урачыстыя лісты, у якіх «агітуе мясцовых работнікаў за ўзыду саветаў», заклікае іх сачыць за скончаньнем рамонту, рыхтаваньнем флёт, а аб самым асноўным, самым патрэбным, без чаго ня можа быць ніякіх гутарак пра навігацыю, аб транфінпляне ў Магілёве запамяталі.

Мала таго, ужо два месяцы назад у Магілеў даслалі штаты камандаў, а яны яшчэ і да гэтага часу не зацьверджаны і судны ня маюць адказнага камандаваньня. Яшчэ невядома, які штат будзе на Гомельскай прыстані.

Надзвычайна важная дырэктыва партыі аб пераводзе суднаў на дзяржразьлік таксама ня выканана. На сёньня параходы ня маюць ніводнага паказьніка ў гэтым напрамку. Няма ніякіх вестак аб тым, калі-ж, нарэшце, гэтыя паказьнікі будуць.

Дырэктыва аб зьніжэньні тарыфаў на водным транспарце ў жыцьцё не ператворана. На прыстанях засталіся тарыфы мінулага году, а аб новых ні чога невядома.

Кіраўніцтва пахавала пад сукном тое, што зроблена на месцы і само ня кіруе, не дае ніякіх паказальнікаў і нічога ня робіць.

Стварыўшаяся становішча пагражае сарваць навігацыю. Перамогі гомельскіх воднікаў па рамонце, іх энтузіязм, іх імкненьне па-бальшавіцку распачаць навігацыю—па віне Дняпро-Дзьвінскага кіраўніцтва параходзтвам застаюцца ў паветры.

Нельга дазволіць зьнішчэньня работы сапраўдных ударнікаў. Неабходна прыняць тэрміновыя меры.

Калі ёсьць энтузіязм, калі ёсьць адраманставаны флёт значыць павінны быць пляны і кіраўніцтва, павінна быць ударная навігацыя трэцяга раШаючага году пяцігодкі.

Л. А.

Ударнікі „Рухавіка Рэвалюцыі"--шэфы гомельскага воднага транспарту

Рабочыя заводу «Рухавік Рэвалюцыі», прапрацаваўшы адозву ЦК, высунулі сустрэчны плян рамонту суднаў і матораў, скончыўшы канчаткова ўвесь рамонт 17 сакавіка. Гэтыя посьпехі дасягнуты імі дзякуючы гераічнай рабоце рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу.

Гэтыя посьпехі дасягнуты імі дзякуючы правільнай генэральнай лініі партыі, дзякуючы гатоўнасьці рабочых змагацца ўсімі сіламі за ажыцьцяўленьне ўсіх партыйных дырэктыў.

Аднак, на гэтым работа яшчэ ня скончана. Трэба дабіцца, каб адраманставаныя машыны знаходзілі ў надзейных руках ударнікаў-капітанаў. Трэба дабіцца, каб рабочыя воднікі з гэтым-жа энтузіязмам выконвалі свае пяказьнікі, з якім рабочыя «Рухавіка Рэвалюцыі» выконвалі плян рамонту.

Рабочыя «Руяхавіка Рэвалюцыі» узялі на сябе абавязацельства дапмагчы воднікам у надыходзячай навігацыі. Лепшыя ўдарныя брыгады замацавалі сябе для шэфства на ўвесь час навігацыі над усімі адзінкамі Гомельскага рачнога флёту.

Дваццаць шэсьць ударнікаў мэханічнага цэху: Калуга, Абрамовіч, Казарчук, Іваноў, Гуценкоў, Серадніцкі, Дымен, Грышчанка, Дрыц, Кавалёў, Пілецкі, Ліпін, Сухаў, Сіманкоў, Рэйзін, Сідаркоўч, Фідэльскі, Карачуж, Марголін, Лянонаў, Дорфман, Фідэльскі, Бялоў, Скурбаро, Дворкін на чале з брыгадзірам Хаўкіным, **бяруць шэфства над параходам «Марак» і землячарпалкамі—Дняпроўскай № 11, Дняпроўскай № 7 і Дняпроўскай № 1.**

Дзевяць ударнікаў: Тышкевіч, Дурачоў, Міраноўіч, Прычко, Штыфман, Габа, Шчэрбаў, Шленскі, Вітаўтаў на чале з брыгадзірам Буднікавым, **бяруць шэфства над параходам «Юныя ленінцы».**

Шэсьць ударнікаў: Лабада, Абрасімаў, Куцінаў, Крысьцінскі, Шэйман, Кабаінікаў на чале з брыгадзірам Курцарам **бяруць шэфства над параходам «Сьлёсар».**

Чатыры ўдарнікі: Шалабасаў, Банкевіч, Яхнін і Юргіс, на чле з брыгадзірам Рабіновічам, **бяруць шэфства над параходам «Прагрэсіст».**

Пяць ударнікаў: Данаў, Любін, Сініцкі, Ліўшыц, Батінскі на чале з брыгадзірам тав. Сярдзюком, **бяруць шэфства над параходам «Чырвоны Араты».**

Шэсьць ударнікаў: Лібман, Карнілаў, Жукаў, Лейкін, Шапіро, Грыдзін на чале з брыгадзірам Белакусавым, **бяруць шэфства над параходам «Пралетарыя».**

Фабзавуч на чале з брыгадзірамі т. т. Гарэлік і Федарчуком **бяруць шэфства над параходам «Стенька Разін» і «Заобалотны».**

Камсамольскі калектыў на чале з сакратаром калектыву тав. Бурсаком **бярэ шэфства над параходам «Луна» і «Масьленшчык».**

Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал і рабочыя кавальскага і лицейнага цэхаў бяруць шэфства над параходамі «Зьвязда», «Асоавіяхімавец» і «Свабода».

Мясцком воднікаў павінен дабіцца ў бліжэйшыя дні афармленьня параходных команд і склікаць супольную нараду шэфскіх брыгад разам з камандамі для выпрацоўкі канкрэтных пляноў шэфства над кожнай адзінкай.

А. С.

Ператварыць сплаўныя пункты

ў баявыя вучасткі ўдарнай работы па сплаву

Грознае папярэджаньне

На рацэ Прыпяці ў раёне Пхова ня бывалае сілы ледаход. Лес, які ў мінулым годзе быў прыгнаны на бераг і прымацаваны канторамі да растучых дубовых дрэў, ледаходам адарваны разам з карэньнямі дрэў, частка рудніча стойкі, якая была ўмацавана за гэтыя дубы, таксама зьнесена ледаходам.

Мабілізавана насельніцтва. Дзяжурыць сапёрныя ўзрыўныя каманды круглыя суткі. Ёсьць пагроза зносу дрэўнянага маста, які знаходзіцца ніжэй пачаўшагася ледаходу.

Тое, што здарылася на Пхове, павінна даць сыгнал нашым лесапрамгасам і заводам, якія ў многіх выпадках адносіліся да справы з халаткам.

Раённыя арганізацыі ня ўсё зрабілі да мабілізацыі грамадзкасьці вакол пытаньняў сплаву, ня гледзячы на тэлеграму сакратара ЦК КП(б)Б і ўпаўнаважанага СНК па сплаве.

Сукала.

Зрываюцца пляны

Па Саланецкім сельсавеце пляны лесазагатовак ня выкананы. Калі брыгадзіры ў старшыні сельсавету запыталі, на колькі процантаў у вас выкананы плян па вывазцы лесу, дык ім адказалі.

— Лесбел не дае зводак аб вывазцы лесу.

І гэта ў той час, як зьвесткі павінны паступаць у сельсаветы праз кожныя 5 дзён.

А сельсавет да такіх зрыўшчыкаў ня прымае ніякіх крокаў. Маюцца выпадкі, калі селянін, атрымаўшы нарад па вывазцы дроў, едзе ў горад Полацк і вам прастаіць цэлы дзень на дварэ.

Сальсавет канкрэтных зрыўшчыкаў работы па вывазцы дроў да адказнасьці ня прыцягвае.

Недастаткова скарыстоўваліся кулацкія коні, а такое зьявішча ўжо ненармальнае ў рабоце сельсавету.

Рабкор Хмель.

Да сплаву не гатовы

(Ад нашага бабруйскага карэсп.)

Апартуністычная бязьдзейнасьць Бабруйскага леспрамгасу, паставіла падрыхтоўку да сплаву пад пагрозу зрыву.

У той час як Бабруйскаму леспрамгасу дана заданьне вывезьці да пачатку сплаву на прыстані 200 тысяч кубаметраў лесаматар'ялу, вывезена яго толькі 45—50 проц.

Такую-ж злачынную бязьдзейнасьць праявіў Бабруйскі леспрамгас у загатоўцы гужбы. Лес, які вывезен на прыстані, не забясьпечаны гужбою і лазою. Заданьне, якое было дана Бабруйскаму леспрамгасу па загатоўцы гужбы выканана ўсяго толькі на 30-35 процантаў.

Гэты прарыў, які мае месца з прычыны апартуністычнай непаваротнасьці і бязьдзейнасьці леспрамгасу будзе мець значны ўплыў на пасьпяховы ход сплаву.

Недаацэнка важнасьці сплаву ва ўсёй народнай гаспадарцы, якою праяўнута ўся работа Бабруйскага леспрамгасу, дапаўняецца яшчэ і тым, што леспрамгас самым упартым чынам ігнарує дырэктывы вышэйшых органаў аб адкамандыраваньні з свайго апарату спэцыялістаў на сплаву на іх непасрэдную работу. На пашеры, як быццам гэтае адкамандыраваньне праведзена, а на справе гэта зьяўляецца толькі нейкім маневрам Бабруйскіх леспрамгасаўпаў.

Усе гэтыя адмоўныя факты—прарывы пагражаюць нармальнаму ходу сплаву. Апартуністы з Бабруйскага леспрамгасу павінны атрымаць за сваю «дзейнасьць», якая цягне за сабою зрыў сплаву, належную кару.

Д. Аланскі.

Пастанова

Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

ПРА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЕ КАРМАМІ АГРАМАДЖАНАГА СЭКТАРУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Выслухаўшы даклады Дырэктара Белсельтрэста т. Грэбенчыка, Старшыні Белкалгасцэнтру т. Міцькова, Кіраўніка Бел. Канторы «Саюзхлеб» т. Бігенбоіма і Старшыні Крычаўскага Раённага Выканаўчага Камітэту т. Семашко аб выкананьні дырэктыў па забясьпечаньні кармамі аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі на час вясеньняй пасеўнай кампаніі, Камісія Выкананьня пры СНК БССР лічыць устаноўленым, што пказаныя цэнтральныя ўстановы, а таксама і часткова Крычаўскі Раённы Выканаўчы Камітэт ня ўжылі належных захадаў да выкананьня дырэктыў СНК у гэтай галіне, у паасобку Камісія Выкананьня адзначае, што:

а) утварэньне браніраваных фуражных фандоў у калгасах праведзена зусім недавальняюча (на 10-IV—1931 г. плян браніраваных фондаў выкананы па грубых кармох на 25,1 проц., па канцэнтраваных—на 40,2 проц.)

б) Белкалгасцэнтр, раённыя выканаўчыя камітэты і райкалгассаюзы не забясьпечылі своечасовае аграмаджаньне кармоў уноў уступаючых у калгасы гаспадарак. Тэмпы аграмаджаньня кармоў значна адстаюць ад тэмпаў калектывізацыі; у некаторых калгасах ёсьць выпадкі разбазараваньня браніраваных фуражных фандоў. Слаба мабілізуюцца ўнутраныя кармавыя рэсурсы; раённымі ўстановамі і арганізацыямі, у паасобку райкалгассаюзамі ня зьвернута належная увага на выкананьне пастаноў Наркамзему і Белкалгасцэнтру аб скарыстаньні адкідаў і ветачнага корму, а Белкалгасцэнтрам ня быў устаноўлен кантроль за выкананьнем гэтых пастаноў;

в) з прычыны недастаткоўнага кантролю і кіраўніцтва з боку Белкалгасцэнтру, Белсельтрэсту і раённых выканаўчых камітэтаў наглядаюцца факты неэканомнага выдаткаваньня кармоў у савецкіх і калектыўных гаспадарках і парушэньне вызначаных норм кармленьня;

г) ня гледзячы на скончэньне вызначанага СНК тэрміну, ня выканан плян сеназагатовак (на 10-IV—1931 г. выканана 69,4 проц. гадавога пляну па сену і 45,8 проц. па саломе).

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць Белкалгасцэнтру пад адказнасьць т. Міцькова і раённым выканаўчым камітэтам, пад адказнасьць старшынь, забясьпечыць поўнае выкананьне на працягу двух дэкад пляну ўтварэньня браніраваных фуражных фандоў у калгасах.

2. Даручыць Белкалгасцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам зьвярнуць асаблівую ўвагу на мабілізацыю ўнутраных кармавых рэсурсаў ў калгасах, на скарыстаньне адкідаў, ветачнага корму і г. д., устанавіўшы спэцыяльны нагляд за выкананьнем гэтай дырэктывы.

3. Даручыць Белкалгасцэнтру і ўсім раённым выканаўчым камітэтам у патрэбных выпадках рабіць перакідку грубых і канцэнтраваных кармоў у найменш забясьпечаньня кармамі калгасы, з тых калгасаў, у якіх ёсьць лішкі гэтых кармоў.

4. Прапанаваць Белкалгасцэнтру ўстанавіць стражэйшы нагляд за эканомным выдаткаваньнем кармоў, не дапушчаючы выдаткаваньня кармоў звыш вызначаных норм, а таксама разбазараваньня ўтвораных браніраваных фуражных фандоў.

5. Прапанаваць Белкалгасцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць на працягу адной дэкады поўнае аграмаджаньне кармавых рэсурсаў новаўступіўшых у калгасы гаспадарак, не дапушчаючы разрыву паміж тэмпамі калектывізацыі і аграмаджаньнем кармоў.

6. Прапанаваць Наркамснабу пад адказнасьць т. Балціна і ўсім раённым выканаўчым камітэтам, пад адказнасьць старшынь, ужыць рашучыя захады да ўзмацненьня загатовак сена і саломы, з тым, каб на працягу двух дэкад закончыць выкананьне гадавога пляну.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **М. Галаздзед.**

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

15 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні

Магілёў. (Наш карэсп.). Засталіся рашаючыя дні лесавывазак. Кожны дзень пагражае паводкай, а па Магілёўскім раёне з лесавывазкамі, становішча пагражаючае.

Гадовае заданьне па будаўнічаму матар'ялу выканана ўсяго на 54,2 проц., па дровах на 57,2 проц.

Пятуцца ў хвасьце выкананьня пляну па лесавывазцы Заходзні, Мацілаўіцкі, Чырвонапольскі і Дашкаўскі сельсаветы. Па гэтых сельсаветах плян лесавывазак выканан ня больш 40—50 проц.

Маюцца сельсаветы, якія паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы у лесавывазках (Вендараскі, Бялевіцкі, Дабрасьневіцкі і Вілаўскі сельсаветы). Гэтыя сельсаветы пляны ўжо вы выканалі.

Засталіся рашаючыя дні. Усе сілы, уся энэргія павінны быць накіраваны на рашучую барацьбу з праявай правага апартуністычнай стаўкі на «самацёк».

Прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні!

А. Нёманскі.

Да Х-годзьдзя Першага Белдзяржтэатру

Ад Украінскага дзяржаўнага чырвоназаводзкага тэатру

ВІТАЕМО БРАТНІЙ БДТ-1!

Колектив Українського Державного чырвонозаводського тэатру палко вітае БДТ-1 з великим святом десятирічної праці.

Щільний зв'язок наших театрів, національних за формою, пролетарських за змістом—є вірною запорукою перамоги працюючих на фронті національно-культурного будівніцтва.

Бажаемо БТД-1 з трецій мистацькій п'ятиричці, далейшого невпинного зростання, радисної творчої праці.

В соціялістичному змаганні національних театрів—збудуемо інтернаціональне мистецтво!

Делегат УДЧТ КАНЕВСЬКИЙ.

Ад ЦП саюзу працмастацтва БССР

ЦП саюзу працмастацтва БССР вітае тэатр з 10-гадовым юбілеем. Тэатр сьвяткуе свой юбілей у час, калі краіна ўступіла ў трэці рашаючы год пяцігодкі, год завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Перад тэатрам стаяць задачы актыўна га ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Выкінуўшы з свайго рэпэртуару п'есы з нацдэмаўскім налётам, тэатр стаў на шлях стварэньня пралетарскага паказу, чым наблізіўся да рабочага глядача.

Старшыня ЦП—ГУРЭ

Другі этап культэстафэты

Кожная школа павінна арганізаваць новы калгас

Асьветнік! Змагайцеся ЗА:
- арганізацыю калгаснага прыліву
- перавыкананьне плянаў сяўбы
- ліквідацыю кулацтва як клясы
- на базе суцэльнай калектывізацыі

Работу школ падпарадкаваць барацьбе за выкананьне задач другой калгаснай вясны

На перадавых пазыцыях другой калгаснай

Падцягнуць адстаючыя вучасткі

Гэтымі днямі адбылася нарада загадчыкаў школ, кіраўнікоў мэтадычных аб'яднаньняў і прафарганізатараў Петрыкаўскага раёну. На нарадзе былі абгавораны пытаньні аб папярэдніх выніках навучальнага году і ўдзеле асьветнікаў і школ у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

На нарадзе высьветлілася, што ў справе культурнай рэвалюцыі па Петрыкаўскім раёне маецца значныя дасягненьні. **Так, усеагульным абавязковым навучаньнем ахоплена 99 проц. дзяцей школьнага ўзросту,** ліквідкампаніямі таксама ахоплена да 80 проц. няпісьменных. Па школах раёну разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў справе акадэмічнай пасьпяховасьці, але, дзякуючы цэламу раду прычын, усё-ж маецца вялікі процант няпісьменных, які дасягае ў асобных школах 20-25 проц.

Амаль усе школы заключылі дагавары па ажыцьцяўленьні палітэхнізацыі з бліжэйшымі калгасамі і саўгасамі. На сёньняшні дзень у справе палітэхнізацыі ўжо маюцца значныя дасягненьні.

Галоўнейшая работа асьветнікаў і школ у сучасны момант—падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны і разгортваньне калектывізацыі.

На сёньняшні дзень раён калектывізаваны на 25 проц. **Ёсьць сельсаветы, дзе процант калектывізацыі дасягае 65-70 (Бабуніцкі, Бобрыцкі).** Разам з гэтым, ёсьць і такія сельсаветы, дзе **калгасамі ахоплена ня больш 2 проц. бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак (Скрыгалаўскі сельсавет).**

Які-ж удзел прымаюць школы і асьветнікі ў падрыхтоўцы да сяўбы і ў разгортваньні калгаснага руху?

Асноўная маса школ і асьветнікаў прымае непасрэдны і практычны ўдзел у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Мацнейшыя сельсаветы, як Камаровіцкі, Бабуніцкі ўзялі на грамадзкі букоў адстаючыя ў справе падрыхтоўкі да сяўбы вёскі і сельсаветы. **Амаль усе настаўнікі раёну — члены калгасаў.**

Разам з гэтым маецца цэлы рад недахопаў і прарываў у рабоце асьветнікаў і школ. Напрыклад, Сьмятаніцкі сельсавет адстае ў падрыхтоўцы да сяўбы і калгасным руху. Калі брыгада асьветнікаў з другога сельсавету прыехала сюды правесьці сход і дапамагчы ў падрыхтоўцы, дык сакратар сельсавету, адкрываючы сход сказаў:

— «Слухайце, таварышы, давайце пытаньні, бо калектывізацыя і веснавая сяўба пытаньне для нас новае».

Здаецца, тут камэнтары непатрэбны. Гэта заява добра характарызуе работу сельсавету і ўсіх мясцовых арганізацый і ўстаноў апошняга. А што робяць у вас асьветнікі? На гэта запытаньне атрымалі адказ: **«настаўніцтва, як культурнай сілы ў нас не адчуваецца, культмасамай работы не праводзіцца. Настаўніцтва Сьмятаніцкага сельсавету сьпіць па 12 гадзін»...**

Стаяць у баку ад вырашэньня задач другой бальшавіцкай вясны і асьветнікі Скрыгалаўскага сельсавету. Больш таго, асьветнікі гэтага сельсавету не ўдзяляюць увагі ліквідацыі няпісьменнасьці і наогул грамадзкай рабоце, відаць, таму па сельсавеце і нізкі процант калектывізацыі. Маюцца яшчэ асобныя ганебныя факты з боку некаторых асьветнікаў.

Настаўніца Загальская зрабіла абразаньне сыну, за што і выключана з саюзу і зьнята з настаўніцкай пасады.

Настаўнік Качук гаворыць: «Пяцігодка апошняя сокі выжмактвае», «жыць не даюць» і г. д.

Некаторыя настаўнікі гораду бяруць у дактароў справкі, што хварэюць і ня могуць прымаць удзелу ў ліквідацыі няпісьменнасьці, што зьяўляецца жаданьнем схавацца ад грамадзкай работы.

Усе гэтыя паасобныя факты—вылазкі клясавага ворага (пазбаўленцаў, кулакоў і інш.), па іх трэба сваячасова ўдарыць, вычышчаць з радоў чырвона штандарнага настаўніцтва.

РМК саюзу працасьветы і інспэктура нарасьветы недастаткова рэагуе на такія факты.

Асьветнікі Петрыкаўшчыны адмежаваліся ад розных клясава-чужых элементаў: Качукоў, Загальскіх і інш.

Асноўная маса асьветнікаў прымае актыўны і непасрэдны ўдзел у сацбудаўніцтве пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, прымае актыўны ўдзел у барацьбе за зе генэральную лінію.

Пост «Сав. Беларусі» А. Пялінскі.

Школа дапамагла арганізаваць калгас

Па Шклове шырока разгарнуласярыхтоўцы да сяўбы, зьбіраюць попел, работа па правядзеньні другога рэйду культэстафэты. Абсьледвана работа гарадзкіх школ у справе ўдзелу іх у веснавой кампаніі. Выяўлена, што школы прымаюць добры ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы, зьбіраюць попел, выдзяляюць у вёскі для распаўсюджваньня работы, дапамагаюць сельсаветам даводзіць плян сяўбы да гаспадарак. Гарадзкая сямігодка арганізавала калгас.

М. Мядзьведзеў.

Змагаюцца за пашырэньне калгаснага руху

Бярэзінская школа сямігодка (Бярэзінскі раён) актыўна ўключылася ў барацьбу за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны. Вучнямі ўжо ачышчана ўсе насеньне ў саўгасе «Бярэзіна». Гэты саўгас адчувае вялікі недахоп рабочай сілы і была пагроза, што авёс застанецца не абмалочаным. Вучні ліквідавалі і гэты прарыў,—авёс ужо абмалочаны. Сіламі вучняў сабрана таксама каля 100 цэнт. попелу і каля 50 кіл. жалезнага лому. У справе разгортваньня калектывізацыі вялікі ўдзел прымае настаўніцтва школы.

Пры ўдзеле настаўнікаў у раёне арганізавана рад калгасаў. Вучні школы абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўзялі на сябе абавязак да веснавой сяўбы ўцягнуць кожнаму свайго бацьку ў калгас.

А. Рубашны.

Вучні дапамаглі ачысьціць насеньне

Касьцюковіцкая ШКМ (м. Касьцюковічы) прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы. Школай былі вылучаны брыгады па ачыстцы насеньня ў калгасе «Парыская камуна». Сіламі вучняў у калгасе было ачышчана ўсё насеньне. Кожны вучань зьбірае ў сябе попел дома, а таксама вядзецца растлумачальная работа аб зборы попелу сярод насельніцтва. На м. Касьцюковічы збор попелу робіцца кожную пяцідзённу. Вучнёўскія брыгады зьбіраюць па мястэчку гной для калгасу. Вучні вядзецца растлумачальная работа сярод бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак аб уступленьні іх у калгас.

Ул. Васілеўскі.

Прасунуць у шырокія масы літаратуру па пытаньнях другой калгаснай

(Поштаграмма ўсім райінспэктарам сацвыху і палітасьветы, усім нізавым арганізацыям саюзу працасьветы)

Па маючыхся ў ЦКА і ЦП саюзу Белпрацасьветы вестках, ход распаўсюджваньня масавай літаратуры па веснавой сяўбе, яўна нездавальняючы.

Ня гледзячы на дырэктывы НКА і ЦП саюзу аб паданьні справе прасоўваньні літаратуры па веснавой сяўбе баявых тэмпаў, гэта работа не заняла ў пераважнай частцы раёнаў належнага месца. Школы, палітасьветныя ўстановы і саюзныя арганізацыі працасьветы, яшчэ ў належнай меры не пераключылі сваёй работы на бальшавіцкія мэтады па прасоўваньню масавай літаратуры да веснавой сяўбы ва ўсе калгасы, саўгасы, аднаасобныя гаспадаркі.

Саюзныя арганізацыі не скарысталі энтузіазму асьветнікаў, а праз іх разам з піянэрскімі арганізацыямі ініцыятыву вучняў у гэтай справе.

Лічачы такое становішча па ўдзеле культпалітасьветустаноў і асьветнікаў у прасоўваньні масавага друку да веснавой пасеўнай кампаніі ненармальным, НКА і ЦП саюзу прапануюць **наступнае:**

1. Інспэктуры, разам з саюзнымі арганізацыямі праверыць ход распаўсюджваньня масавай літаратуры па веснавой і ўдзел у распаўсюджваньні школ, палітасьветных устаноў, асьветнікаў.

2. Намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па масавым прасоўваньню гэтай літаратуры, шляхам арганізацыі брыгад з піянэраў, вучняў, асьветнікаў.

3. Намеціць мерапрыемствы па арганізацыі масавага кніганошаства з піянэраў і вучняў.

4. Шырока практыкаваць мэтады выставак, перасовак, арганізацыю кніжных базараў, адчыненьне шоскаў у часе масавых мерапрыемств, правадзімых у раёнах.

5. Правесьці кампанію па ахопу ўсіх калгасьнікаў, саўгасьнікаў, батрацтва, беднаты і серадняку падпіскай на пэрыдычны друк (газэты, часопісы).

6. Поўнасьцю выканаць дырэктывы, паказаныя ў заданьнях па гэтым пытаньні па другім этапе культэстафэты з боку Цэнтральнага Штабу.

7. Аб прынятых мерах па выкананьні гэтай дырэктывы паведаміць НКА і ЦП саюзу працасьветы.

Нам. Наркома Асьветы Бялуга.
Адк. Сакратар ЦП саюзу Працасьветы Дварэцкі.

Работу школы ўвязваюць з вырашэньнем задач другой калгаснай

Гарадзецкая школа-сямігодка, Рагачэўскага раёну, выкананьне вучэбных плянаў увязвае з грамадзкай працай, увязвае з палітэхнізацыяй. Так, вучні старэйшых груп працуюць на ліквпунктах, ўдзельнічаюць таксама ў выпуску насьценных газэт. Вылучана брыгада для дапамогі рэдкалегіі калгасу «Свабода» па выпуску насьценгазэты.

Вылучаныя брыгады па ачыстцы насеньня ў калгасах ужо прарабілі вялікую работу, якую працягваюць.

Арганізаваны брыгады для агляду маючыхся на тэрыторыі сельсавету ўстаноў. Брыгады праводзяць праверку падрыхтоўкі і да сяўбы. Праводзіць школа вялікую работу і па папулярызацыі калгаснага будаўніцтва.

Ян. Зуевіч.

Выраўняць фронт барацьбы за калгасны прылій

МАЗЫР. (Наш кар.). Даманавіцкая школа калгаснай моладзі (Мазырскі р-н) мае вялікія дасягненьні ў сваёй рабоце. У школе выхаваліся новыя маладыя кадры селькораў, якія змагаюцца за пашырэньне калгаснага руху. Вучні-селькоры ў першых радох падрыхтоўкі да веснавой сяўбы—яны прымаюць удзел па ачыстцы насеньня, рамонту інвэнтара і г. д. Школа ў цэлым таксама актыўна змагаецца за вырашэньне задач другой бальшавіцкай вясны.

Але разам з тым, у Мазырскім раёне некаторыя школы яшчэ не пераключыліся на бальшавіцкія тэмпы па забясьпечаньні выкананьня гэтых важнейшых задач. Так, напрыклад, **Клінская школа,** загадчыкам якой зьяўляецца тав. Булаўка, да гэтага часу стаіць у баку ад усіх правадзімых кампаній, у баку ад калгаснага будаўніцтва. Школа ў вёсцы Навіках таксама стаіць у баку ад калгаснага будаўніцтва. Зусім ніякай работы не праводзіць тэта школа з аднаасобнікамі-беднякамі і сераднякамі па ўцягненьні іх у калгас. Не адстае ад гэтых школ і **Лубнянская школа,** якая таксама не змагаецца за пашырэньне калгасаў.

Трэба вопыт лепшых школ, якія пабавому змагаюцца за пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, за арганізацыю калгаснага прыліву шырока распаўсюджваць. Раўпраўленьне саюзу працаўнікоў асьветы Мазырчыны павінна прыняць адпаведныя захады да тых асьветнікаў, школы якіх стаяць у баку ад вырашэньня задач другой бальшавіцкай сяўбы.

Х. Прыбыль.

У Савеце Народных Камісараў

СНК БССР вынес рашэньне аб вызваленьні тав. Рапапорта ад абавязкаў старшыні Дзяржаўнай Палітычнай Управы пры СНК БССР у сувязі з пераходам яго на другую працу.

Савет Народных Камісараў назначыў тав. Рэдэйса старшынёй Дзяржаўнай Палітычнай Управы пры СНК БССР з правам пастаноўчага голасу ў СНК.

Гэтую пастанову СНК падае на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК БССР

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ да другой бальшавіцкай

Арганізаваць належны догляд за парасятамі

Компартыя і савецкі ўрад паставілі задачу ў самы кароткі час вырашыць праблему жывёлагадоўлі. Гэтая задача можа быць вырашана шляхам стварэньня буйных фабрык малака і мяса—жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў.

Тав. Якаўлеў у сваім дакладзе на VI партзьезьдзе «Аб калгасным руху і ўздыме сельскай гаспадаркі» між іншым адзначыў, што «пры рашэньні гэтых пытаньняў усе даныя гавораць за тое, што сьвіньня нам дапаможа найбольш хутка вырашыць мясную праблему. Сьвіньня мае дзьве асноўных і надзвычайна каштоўных перавагі, якія павінны быць ўсьвядомлены як усёй партыяй, так і ўсёй краінай. Сьвіньня хутчэй усіх відаў жывёлы дае мяса і на адзінку спажываемага корму яна дае больш мяса, чым буйная рагатая жывёла. Гэтыя дзьве перавагі высоўваюць сьвіньню на першае месца»...

Вось чаму на разьвядзеньне і гадоўлю сьвіней трэба зьвярнуць вялікую ўвагу.

Ніжэй мы падаем памятку для сьвіньнароў па доглядзе за парасятамі, якую кожны сьвінар, кожная брыгада, кожны цэх павінны дакладна вывучыць.

1. Паросная матка павінна быць сярэдняй сытнасьці, бо вельмі адкормленая ці вельмі худая прыводзіць слабых і няжыцьцёвых парасят; апрача таго, у такой маткі бывае мала малака.

2. За 2 тыдні да апаросу сьвіньню трэба перавесьці ў апаросны сьвінарнік станок. Месца, дзе будзе стаяць сьвіньня, трэба папярэдня прадэзынфэктаваць.

3. Прасачы за тым, каб у пераведзенай на апарос сьвіньні ня было на целе чужаедаў.

4. Не забывай выпускаць паросную сьвіньню на прагулку.

5. Сачы за тым, каб паросная сьвіньня не рабіла шпаркіх рухаў.

Паросная сьвіньні трэба даваць добраякасны корм і не паіць вельмі халоднай вадой. У корм маткі трэба дадаваць такую мінэральную падкормку, як мешанка з бітай атынкоўкі, попел, вугаль, пясок і інш.

У выпадку запору зараз-жа зьвярніся да вэтэрынара ці заатэхніка.

7. У апошні месяц перад апаросам сьвіньні зусім ня трэба даваць жалудоў, гарохавай і вікавай мукі, вялікай колькасьці ячменнай мукі, якія моцуць выклікаць запор. Лепшымі кармамі для паросных сьвіньні зьяўляецца ўсянка, пшанічныя вопрубі, гатаваная бульба, сырыя буракі, сена з люцэрны і канюшыны, ільняная макуха. Корм паросных матцы неабходна даваць у выглядзе рэдкага пойла.

8. Ня стаў сьвіней на апарос у блізкія да дзвярэй загараді і ўніжай, каб на яе ня дзьмула халоднае паветра праз фортку.

9. Дні за два да апаросу дай сьвіньні больш мяккага подсьцілу.

10. Загадзя прыгатуй усё, што можа быць патрэбна пры апаросе (скрынку для парасят, узімку бутэлькі з цеплаватай 50-60 град. вадой і інш.).

11. Не запамятай наліць у кармушку ў час апаросу чыстай вады.

12. У час апаросу сачы за тым, каб ня было лішняга шуму, бегатні і іншага непакою.

13. Толькі што нарадзіўшыхся парасят вытры насуха чыстай анучкай, асабліва ногі і пад пахамі. Пупавіну ў парася адпчыпні ня менш як на 7-8 сант. ад пупка.

14. Сачы, каб рукі пры прыёмцы парасят былі чыста вымытыя і наогул пільна сачы за чыстатой пры апаросе.

15. У выпадку зацяжных патуг апаросу, нявыхаду посьледу хутчэй зьвярніся да спэцыялістаў.

16. Зараз-жа прыбірай у асобную скрынку посьлед, пупавіны і мертвых парасят, каб усё гэта не заставалася ў станку, а пасьля закапай.

17. Прымі ўсе меры перасьцярогі, каб сьвіньня ня ела і ня душыла парасят—лепш першыя 3 дні трымай парасят у скрынцы, і кожную гадзіну падпускай іх да маткі.

18. Перад першым подпускам парасят да маткі трэба памыць ёй вымя слабым растворам крэаліны і цёплай вады (1 проц.) і выцерці чыстым ручнікам.

19. Не кармі сьвіньню ў часе апаросу і 6 гадзін пасьля апаросу. Корм у першыя дні трэба даваць рэдкі, норму павялічвай паступова.

20. Калі парасяты слабыя ці ў сьвінарніку холадна палажы ў скрынку з парасятамі пад салому бутэлькі з цёплай вадой (50-60 град.).

21. У выпадку запаленьня вымя, запору або адсутнасьці малака ў маткі—зараз-жа зьвярніся да спэцыялістаў.

22. Ня турбуй матку ў час апаросу і ў першыя дні пасьля апаросу.

23. Сачы, каб у маткі ў станку было чыста і даволі добрага подсьцілу.

24. Сачы, каб у апаросным сьвінарніку было цёпла (6-10 град.) і чыстае паветра.

25. З 4-5 дню пасьля апаросу выпаняй матку з парасятамі на прагулку ўлетку на двор, а ўзімку ў манеж; пры гэтым сачы, каб парасяты вельмі не захаладалі.

26. Узімку ў станок маткі з парасятамі пастаў нізенькую скрынку, куды кожны дзень насыпай сьвежай мешанкі, піску, тоўчанай цэглы, попелу з вуглямі і крэйды.

27. Старайся раней прывучыць парасят да падкормкі, асабліва калі ў маткі мала малака.

28. Не пакідай доўга ў станку ня зьедзеную парасячую падкормку, а ў кармушцы маткі яе корм.

29. Пастаў у падкормачнае аддзяленьне другую скрынчачку, куды насыпай крыху падпражанага пшэнічнага ці сечанага ячменю, які мяняй кожны дзень.

30. Правер ці зроблена тубэркулізацыя кароў, ад якіх даецца малако парасятам, і наогул ці здаровыя жывёлы.

31. Матцы і парасятам давай толькі добраякасны корм.

32. Ня трымай малако для парасят на сонцы.

33. Улетку як мага больш скарыстоўвай пашу.

34. Адвучаць парасят ад маткі трэба паступова на працягу 3-5 дзён.

35. Ня стаў у час адвучэньня парасят у суседнія станкі з іх маткай.

36. Памятай, што чыстата, цёплае, сухое, сьветлае памяшканьне, сухасьць сьвінарніка і сьвежае паветра ў ім, а таксама прагулкі на сьвежым паветры і добры харч—ёсьць парука пасьпяховага гадаваньня парасят.

37. Калі ў гаспадарцы не з'арганізавана ўдарная брыгада па гадаваньні парасят, прымі актыўны ўдзел у яе арганізацыі і выклікай на сацспаборніцтва суседнюю гаспадарку.

Пералічаныя тут мерапрыемствы, як даглядаць сьвінаматак і парасят, павінны быць дакладна вывучаны ўсімі сьвінарамі, брыгадзірамі, рабочымі. Гэтая памятка павінна быць шырока абгаворана на сходах брыгад, цэхаў.

Трэба дабіцца, каб ад кожнай сьвінаматкі атрымаць ня менш 12 таварных парасят у год.

Пастанова партыі і ўраду аб будаўніцтве буйных фабрык мяса і малака павінна быць выканана.

Ж.

„Качагары" ў БДТ-2

Беларускі 2 Дзяржаўны Тэатр закончыў працу па афармленьні прем'еры «Качагары». Зьмест гэтай п'есы, напісанай тав. Гурокім І., разгортваецца на сучасным беларускім матар'яле, маючым актуальна-палітычнае значэньне. Асноўнае мэтаімкненьне гэтага паказу—асьвятліць у мастацкіх вобразах кіруючую ролю рабочае клясы ў барацьбе за ператварэньне Беларусі з краіны адсталай сялянскай у краіну індустрыяльна-калгасную. Акрамя таго ў ёй закрануты пытаньні барацьбы з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам. У гэтай пастаноўцы БДТ 2 зацьвярджае і пашырае тыя прынцыпы, якія былі ім высунуты ў сцэнічную працу на даным этапе свайго творчага разьвіцьця. Гэта—рашучае вылучэньне маладняка і ўпор на дэтальную сцэнічную распрацоўку вобразаў рэвалюцыйнай масы. У гэтай пастаноўцы БДТ 2 імкнуўся стварыць новыя мэтады перадачы мастацкіх форм, а таксама і новыя мэтады вытворчай працы па афармленьні паказу. Упяршыню ў сыстэму працы над гэтым паказам уводзіцца прэміраваньне актора-ўдарніка ня толькі за лепшыя адносіны да вытворчасьці, але і за лепшае мастацкае стварэньне і выкананьне сцэнічных вобразаў.

Для гэтай мэты пры дапамозе рэдакцыі газэты «Рабочий» была спачатку арганізавана папярэдняя чытка п'есы, абмеркаваньне пастановачнага пляну і макета акторскім калектывам разам з працаўнікамі рэдакцыі і рабкорамі газэты «Рабочий». На гэтым спатканьні працаўнікоў сцэны з працаўнікамі друку была заключана сацыялістычная ўмова паміж калектывамі работнікаў БДТ 2 і газэтай «Рабочий». Паводле гэтай ўмовы ў працу тэатру над афармленьнем пастаноўкі былі прыцягнуты рабочыя брыгады з заводаў «Эльвод» і «Дрэваапрацоўшчык». Працаўнікі газэты «Рабочий» узялі на сябе абавязак дапамагаць набліжэньню



Макет пастаноўкі «Качагары» (Электрастанцыя).

рабочага гледача да вытворчай працы тэатру. Рабочыя брыгады у якасьці консультантаў выказвалі свае думкі, ці правільна з іх погляду аўтар, рэжысэр і акторы трактуюць сцэну, ці жыцьцёвы і клясава выпрыманы тыя ці іншыя вобразы, таксама як і ўсё афармленьне пастаноўкі. Аб сваёй дзейнасьці брыгады рабілі справаздачу на старонках газэты «Рабочий».

У выніку гэтай працы ў пастаноўку ўведзены шэраг тэхнічных і мастацкіх зьмен, якія значна палепшылі якасьць паказу. Сумесная праца тэатру з прадстаўнікамі рабочага гледача цалкам сябе апраўдала. Гэта зьяўляецца першым вопытам вынясьненьня тэатральнай творчай работы ў шырокія масы з непасрэдным удзелам у пастаноўцы рабочага гледача. БДТ 2 лічыць, што ў мэтах набліжэньня мастацтва да працоўных, рабочы глядач сам павінен непасрэдна ўдзельнічаць у апрацоўцы сцэнічнай прадукцыі тэатру. Вопыт БДТ 2—першы для ўсіх нашых дзяржаўных тэатраў, чакае шчэ свайго вывучэньня і ўдасканаленьня.

У мэтах агітацыйнага і прапагандысцкага ўзьдзейнічаньня на гледача ўнутры і вакол тэатру, на тэму пастаноўкі зроблена сіламі акторскага калектыву адпаведная вытворчая выстаўка. Аўтарам пастаноўкі «Качагараў» зьяўляецца малады рэжысэр тэатру т. Мацкевіч, былы актор БДТ 2. Музыка для пастаноўкі напісана І. Гідгарцам. Мастацкае афармленьне мастака-архітэктара Гольца.

19 красавіка адбудзецца адкрыты грамадзкі прагляд «Качагараў», на які разам з брыгадзірамі «Эльводу» і «Дрэваапрацоўшчыку» запрошаны лепшыя ўдарнікі буйных фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў гор. Менску.

В. Вольскі.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

19-IV г. г. а 7 гадзіне ў памяшканьні Навукова - Дасьледчага Інстытуту Пэдагогікі (Унівэрсітэцкі Гарадок, Прырод. корпус), адбудзецца сход та варыства Пэдагогаў-Марксыстаў.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

ЗПАНЯДЗЕЛКА 13-гаКРАСАВІКА

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	Сёньня адкрыты спэктакль **КАЧАГАРЫ** І. ГУРСКІ. Пачатак а 8 гадзіне.
Кіно-тэатр „Культура"	**Старац Васіль Гразноў** Хроніка № 13. Пач.: 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса—з 5 гадз.
„Чырвоная Зорка"	**ДЗЬВЕ СІЛЫ** Гукавы фільм ПОШТА. Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ	2-гі тыдзень. Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	2 фільма ў 1 сэанс. Пат і Паташон у лепшай камэдыі 1. Пачатак кар'еры у 7 частк. 2. Замежны паход у 2-х частк. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр"	Кіно-п'еса ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ у 6 части. Звыш праграмы хіно-хроніка № 16. Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад панядзелка 20 красавіка

Новы мастацкі фільм вытворчасьці Белдзяржкіно аб'ядн. Саюзкіно

СУД ПАВІНЕН ПРАЦЯГВАЦЦА

Рэж. Е. Дзыган. Апэратар Н. Страж.

Да ведама фабзаўмясцкомаў! З 17-IV пачаўся папярэдні продаж білетаў для арганізаванага глядача са скідкай у тэатр. раб. касе.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе 1-го дакуманту **1 руб.**

АДКРЫЦЬЦЕ 1-га УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАЦЭНАЛІЗАТАРАЎ, РАБОЧЫХ ВЫНАХОДЦАЎ-УДАРНІКАЎ І ПРАДСТАЎНІКОЎ АДДЗЕЛАЎ ТЭХНІЧНАГА КАНТРОЛЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ В.С.Н.Г.Б.

АДБУДЗЕЦЦА

20-га красавіка, а 5 гадзіне дня, у г. Менску, у памяшканьні Дому Калгасьніка.

Дэлегаты зьезду атрымліваюць мандаты ў ВСНГБ, пакой № 22, раніцою 20 красавіка.

Запрашаюцца рабочыя прадпрыемстваў.

Білеты атрымліваць па прадпрыемствах.

ВСНГБ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА МАЙ І ДАЛЕЙШЫЯ МЕСЯЦЫ 1931 г. НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Орган ЦВК і СНК БССР

Падпіска прымаецца выключна на пошце да 27 чысла.

Даводзіцца да агульнага ведама, што згодна пастановы СНК БССР ад 23-III—31 г. пры Наркамснабе БССР арганізавана Дзяржаўнае Гандлёвае прадпрыемства пад назвай **„БЕЛГАНДАЛЬ"** якое дзейнічае па пачатках гаспадарчага разьліку [illegible] вытварэньне раздробленага гандлю прадуктамі харчаваньня [illegible]

Сакратар НКСнабу [illegible]

МЕНСКАЕ ГАРАДЗКОЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ КУПЛЯЕ Ў НАСЕЛЬНІЦТВА МЕДНУЮ МАНЭТУ ЦАРСКАЙ ЧАКАНКІ

з аплатай **80 КАП. ЗА АДЗІН КГР.,** альбо аднэй чацьвертай часткі кошту пастаўленага на манэце.

Мен. Гар. Аддз. Дзяржбанку.

Рэчыцкі Гар. ЗАГС выклікае на 28 красавіка г. г. гр-на Астрадзімава Івана Паўлава па справе скасаваньня шлюбу з яго жонкаю Фельтольц Марыяй Рыгоравай.

Згублена печатка калгасу «Чырвоны Сормавец», Чэрыкоўскага раёну. Лічыць несапраўднай.

Нарсуд Рэчыцкага раёну, на падставе прысуду ад 18 сакавіка 1931 г. па арт. 196 з санк. 213 арт. КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне сакратару Нахаўскага с/с Юнкеру Ільлі Навумаву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Асмолаўскай крамы Бярэзінскага спажыў. т-ва Рыбачанку Міколу Паўлаву.

Вайскова-служачы Ладыка Сямён Захаравіч, родам з гр. Палтаўскай акругі, Грунскага раёну с. Рыбальск, знаходзячыся ў г. Магілеве на вайсковай службе, зьменяе свае прозьвішча і імя на прозьвішча Васільчанка.

Просьба да асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, паведамець аб гэтым Магілеўскі Гар. ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча і імя і імя на бацьку, і месца жыхарства.

Нарсуд Нараўлянскага раёну, на падставе прыгавару ад 28-га кастрычніка 1930 г. па крым. справе № 1452, па 196 з карн. санк. 213 арт. КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Вараб'еву Васілю Іванаву, за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Менскі акруговы Загс выклікае гр. Райнэса Майсея Абрамава на 9 мая 1931 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Райнэс Геней Фетгушавай.

Гр-н Басякоў Уладзімер Сідараў, які паходзіць з гр-н в. Старое Село, Веткаўскага раёну і жыве ў г. Менску, нарадж. 1907 г., зьмяняе прозьвішча і імя з прозьвішча і імя Басякоў Уладзімер на прозьвішча і імя Сьмірноў Мікалай.

Нарсуд Буда-Кашалёўскага раёну, на падставе прысуду ад 14-III—31 г. па арт. 196 з санк. 213 арт. КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне былому загадчыку Буда-Кашалёўскай Райашчадкасы Лісейчыкаву Гаўрылу Сяргеяву за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Гр-н Нічыпарэнка Міхась з в. Сьвяціловіч, Веткаўскага раёну, нарадж. 1909 г., зьмяняе свае прозьвішча Нічыпарэнка на прозьвішча Шалюта.

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць Веткаўскі РайЗАГС.

Нарсуд Жыткавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 8-га лютага 1931 г. па арт. 196 з санк. 213 арт. КК, за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Таруціс. Паўліне Вэнадыктавай—члену праўленьня і Сакалоўскаму Захару—старшыні праўленьня калгасу «Палескі Гігант» у в. Доўгая Дуброва Жыткавіцкага раёну.

Нарсуд Жыткавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 19-га студзеня 1931 г. па арт. 213 КК, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Брэгману Лейбе Давідаву—багатоўшчыку скуравіны Людзіневіцкага загатоўчага пункту.

Слуцкі ЗАГС выклікае гр. Самонька Міколу Сяргеяна на 28-га красавіка 1931 г. па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Самонавай А. К.

Гр-ка Сыпічэўская Алена Яўхімавна, якая паходзіць гр-н в. Лиманцэвічы, Падгайскага с.-с., Менскай прыгараднай мяжы, нарадж. 1907 г., зьмяняе імя Алена на імя Таіса.

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя, просяць паведаміць аб гэтым Менскі ЗАГС, паказаўшы свае прозьвішча і імя і места жыхарства.

Менскі акруговы Загс выклікае гр. Мільнэра Ісэра Аронава на 7 мая 1931 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Мільнэр Соней Вульфавай.

МенЗАГС выклікае на 30 красавіка 1931 году гр-ку Беразоўскую Еўдакію Захараву па справе скасаваньня шлюбу з гр-ам Беразоўскім Уладзімерам Кастусёвым.

ЗГУБЛЕНЫ:

Пасьведчаньне за № 21177 Цімашенк Т. В., выд. Мсьціслаўскай Міліцыяй Квіт. 1531-п.

З публікацыю пячотку калгасу «Шлях да пабеды», Стрэшын, Жлобінскага раёну, лічыць несапраўднай.

Членская кніжка № 92993 Штукінаў Х., выд. саюзам работ. зямлі і лесу. Квіт. 1533-п.

Вайсковая кніжка на імя Націнскага І. Ф., выд. Бабруйскім Артпалком, кв. 145-п.

Выканаўчы ліст № 235 Турэўскага Нарсуду па іску Брэгмана да Рычоўскага на 240 руб. Квіт. 1534-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, д. № 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата 1 месяц—90 кап., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00 на год—8,00.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

ПРЗЗ ЗАЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2